4) $\sqrt[3]{-x^3 + x^2 + 2x - 15} = -x$;
5) $\sqrt[5]{-32x^5 - x^2 - 2x + 24} = -2x$;
6) $\sqrt[5]{-243x^5 - x^2 + 5x + 24} = -3x$.

1.235°. 1) $\sqrt{5 + 2x} = 3$; 2) $\sqrt{3x + 7} = 4$;
3) $\sqrt{x^2 + 19} = 10$; 4) $\sqrt{61 - x^2} = 5$;
5) $\sqrt[3]{6x + 1} = -5$; 6) $\sqrt[3]{x - 3} = -2$;
7) $\sqrt[5]{x^3 - 32} = 2$; 8) $\sqrt[4]{x^3 - 44} = 3$.

1.236°. 1) $\sqrt{4x^2 + 5x + 4} = 2$; 2) $\sqrt{11 - 5x^2 + 3x} = 3$;
3) $\sqrt[3]{x^2 + 4x - 50} = 3$; 4) $\sqrt[3]{x^2 + 14x - 16} = -4$.

1.237. 1) $\sqrt{11-\sqrt[3]{x+7}}=3$; 2) $\sqrt{5+\sqrt[3]{x+3}}=3$;

3) $\sqrt[3]{24+\sqrt{x^2+5}}=3$; 4) $\sqrt{18-\sqrt[3]{x+10}}=4$;

5) $\sqrt{1+\sqrt[3]{x^2+4x+6}}=2$; 6) $\sqrt[3]{5+\sqrt[3]{x^2+14x-16}}=1$.

1.238. 1) $\sqrt{x+2}=\sqrt{2x-5}$; 2) $\sqrt{5x-1}=\sqrt{3x+19}$;

3) $\sqrt{x-4}=\sqrt{x^2-5x+1}$; 4) $\sqrt{x-1}=\sqrt{x^2-4x+5}$;

5) $\sqrt[8]{x^2-36}=\sqrt[8]{2x-1}$; 6) $\sqrt[10]{x^2-16}=\sqrt[10]{8-5x}$.

1.239. 1) $\sqrt{x+2}=x$; 2) $\sqrt{x+6}=x$;

3) $\sqrt{x+6}=-x$; 4) $\sqrt{x+2}=-x$;

5) $\sqrt{7-x}=x-1$; 6) $\sqrt{5x+1}=1-x$;

7) $\sqrt{4+2x-x^2}=x-2$; 8) $\sqrt{6-4x-x^2}=x+4$.

1.240. 1) $\sqrt{x^2-x-14}=x+2$;

2) $\sqrt{4x^2+7x+2}=2x-1$;

3) $\sqrt[3]{x^3-9x^2+28x-27}=x-3$;

4) $\sqrt[3]{x^3+6x^2-4x+8}=x+2$.

1.241. 1) $\sqrt{x^2+\sqrt{x+2}}=x+1$;

2) $\sqrt{x^2+\sqrt{5x+19}}=x+3$;

3) $\sqrt[3]{x^3-6x^2+4\sqrt{x+14}}=x-2$;

4) $\sqrt[3]{x^3+3x^2-\sqrt{5-10x}}=x+1$.

1.242. 1) $\sqrt{2x+5}+\sqrt{x-1}=8$; 2) $\sqrt{x+3}+\sqrt{3x-2}=7$;

3) $3\sqrt{x}+\sqrt{11x-2}=6$; 4) $2\sqrt{3x+2}-\sqrt{6x}=2$;

5) $\sqrt{x+2}=\sqrt{3-x}+3$; 6) $\sqrt{x-13}=\sqrt{8+x}-3$.

1.243. 1) $(x^2+5x)\sqrt{x-3}=0$;

2) $(x^2+x)\sqrt{x-1}=0$;

3) $(x^2-4)\sqrt{x+1}=0$;

4) $(x^2-16)\sqrt{2-x}=0$;

5) $(x^2-11x+24)\sqrt{x^2-7x+10}=0$;

6) $(x^2-2x-3)\sqrt{x^2+x-6}=0$.

1.244. 1) $\sqrt[4]{x^2-x-12}\cdot\sqrt[9]{x^2+2x}=0$;

2) $\sqrt[8]{x^2-7x-18}\cdot\sqrt[12]{3x^2+18x}=0$;

3) $\sqrt[6]{14-x^2-5x}\cdot\sqrt[9]{x^2-2x+1}=0$;

4) $\sqrt[4]{40-x^2-3x}\cdot\sqrt[13]{x^2-4x+16}=0$;

5) $\sqrt[3]{x^2-6x+8}\cdot\sqrt[4]{x^2+6x-27}=0$;

6) $\sqrt[5]{x^2-x-12}\cdot\sqrt[20]{x^2-25}=0$.

1.245. 1) $(x+1)\sqrt{x^2-6x+17}=3x+3$;

2) $(x+1)\sqrt{x^2+x-2}=2x+2$;

3) $(x-1)\sqrt{x^2-x-6}=6x-6$;

4) $(x+2)\sqrt{x^2+2x-6}=3x+6$.

1.246. 1) $\sqrt{x}-3=2\sqrt[4]{x}$; 2) $\sqrt{x}+\sqrt[4]{x}-6=0$;

3) $\sqrt[3]{x}+\sqrt[6]{x}-2=0$; 4) $9-8\sqrt[6]{x}-\sqrt[3]{x}=0$;

5) $2\sqrt[3]{x}+5\sqrt[6]{x}=18$; 6) $2\sqrt[8]{x}=3-\sqrt[4]{x}$.

1.247*. Пры якіх значэннях a мае адзінае рашэнне ўраўненне:

1) $\sqrt{x+a}=\sqrt{4-x}$; 2) $\sqrt{a-x}=\sqrt{7+2x}$;

3) $\sqrt{x+4}=a-2$; 4) $\sqrt{8-x}=a+1$;

5) $\sqrt{x-a}=1-x$; 6) $\sqrt{a-x}=1+x$;

7) $\frac{a}{\sqrt{x}+2}=2-\sqrt{x}$; 8) $\frac{a}{\sqrt{x}-5}=5+\sqrt{x}$?

1.248*. Рашыце ўраўненне з невядомым x:

1) $\sqrt{x-4}=a$; 2) $\sqrt{x+1}=-a$;

3) $a\sqrt{x+2}=0$; 4) $(x-a)\sqrt{x-3}=0$;

5) $(x+1)\sqrt{x-a}=0$; 6) $\sqrt{x}\sqrt{x-a}=0$;

7) $\frac{x-a}{\sqrt{x-2}}=0$; 8) $\frac{x-2}{\sqrt{x+a}}=0$.

1.14. Рашэнне ірацыянальных ураўненняў з выкарыстаннем уласцівасцей функцый

Удакладнім азначэнне ўраўнення з адной зменнай, дадзенае ў папярэдніх классах.

Няхай f і g — функцыі ад зменнай x, D — мноства ўсіх значэнняў зменнай x, пры якіх вызначаны абедзве гэтыя функцыі. Роўнасць

$$f(x) = g(x)$$

называецца ***ўраўненнем са зменнай x***, а мноства D — ***абсягам вызначэння*** гэтага ўраўнення (або *абсягам дапушчальных значэнняў зменнай*).

Зменную ва ўраўненні называюць таксама ***невядомым***.

Коранем або ***рашэннем*** ураўнення $f(x) = g(x)$ называецца такі лік $c \in D$, пры якім $f(c) = g(c)$ — правільная лікавая роўнасць.

Тэарэма. Ураўненне

$$f(x) = g(x), \tag{1}$$

дзе f — нарастальная і g — спадальная функцыі, вызначаныя на адным і тым жа мностве, мае не больш за адзін корань, г. зн. або зусім не мае каранёў, або мае адзіны корань.

(Сапраўды, на рысунку 20, *а*, *б* бачна, што графікі нарастальнай функцыі f і спадальнай функцыі g перасякаюцца на абсягу вызначэння не больш чым у адным пункце.)



Рыс. 20

▲ Д о к а з. Няхай x_0 — корань ураўнення (1), г. зн.

$f(x_0) = g(x_0)$ — правільная лікавая роўнасць.

Калі $x < x_0$, то па азначэнні нарастальнай і спадальнай функцый маем

$$f(x) < f(x_0), \qquad g(x_0) < g(x).$$

Такім чынам, $f(x) < f(x_0) = g(x_0) < g(x)$, г. зн. $f(x) < g(x)$. Значыць, ніякі лік $x < x_0$ коранем ураўнення (1) не з'яўляецца. Аналагічна даказваецца, што і ніякі лік $x > x_0$ не з'яўляецца коранем ураўнення (1).☒ ▲

З а ў в а г а. Гэтая тэарэма справядлівая і тады, калі адна функцыя нарастальная (спадальная), а другая пастаянная.

Прывядзём некалькі прыкладаў, дзе пры рашэнні ірацыянальных ураўненняў выкарыстоўваюцца ўласцівасці нарастання і спадання функцый.

П р ы к л а д 1. Рашыць ураўненне $\sqrt{2x-1} = 4 - 3x$.

Р а ш э н н е. *Спосаб* 1. Падборам знаходзім, што $x = 1$ з'яўляецца коранем дадзенага ўраўнення. Сапраўды, $\sqrt{2\cdot1-1} = 4 - 3\cdot1$ — правільная лікавая роўнасць.

Паколькі функцыя $f(x) = \sqrt{2x-1}$ нарастальная, а функцыя $g(x) = 4 - 3x$ спадальная, то згодна з тэарэмай $x = 1$ — адзіны корань дадзенага ўраўнення.

А д к а з: 1.

Спосаб 2. Магчыма і іншае рашэнне:

$$\sqrt{2x-1} = 4 - 3x \Leftrightarrow \sqrt{2x-1} + 3x = 4.$$

Паколькі функцыя $h(x) = \sqrt{2x-1} + 3x$ нарастальная, то (гл. заўвагу) ураўненне $h(x) = 4$ мае не больш за адно рашэнне. Падборам знаходзім корань $x = 1$.

П р ы к л а д 2. Рашыць ураўненне $\sqrt[10]{9-4x} = \sqrt[7]{2x-3}$.

Р а ш э н н е. Падборам знаходзім, што лік 2 — корань дадзенага ўраўнення, паколькі $\sqrt[10]{9-4\cdot2} = \sqrt[7]{2\cdot2-3}$, г. зн. $1 = 1$ — правільная лікавая роўнасць. Іншых каранёў ураўненне не мае, паколькі функцыя $f(x) = \sqrt[10]{9-4x}$ з'яўляецца спадальнай, а функцыя $g(x) = \sqrt[7]{2x-3}$ — нарастальнай.

А д к а з: 2.

▲ Часам пры рашэнні ірацыянальных (і іншых) ураўненняў бывае карысна спачатку знайсці абсяг вызначэння ўраўнення.

Прыклад 3. Рашыць ураўненне:

а) $(x+7)\sqrt{x+5} = (5-2x)(x+7);$ (2)

б) $(x+7)\sqrt{5-x} = (9-2x)(x+7).$ (3)

Рашэнне. а) Значэнне $x=-7$ не належыць абсягу вызначэння ўраўнення (2), паколькі пры гэтым значэнні выраз $\sqrt{x+5}$ не мае сэнсу. Таму $x+7\neq 0$, і ўраўненне (2) раўназначна ўраўненню

$$\sqrt{x+5} = 5-2x. \tag{4}$$

Рэшым гэтае ўраўненне, перайшоўшы да ўраўнення-выніку:

$$x+5=(5-2x)^2,$$

$$x_1 = \frac{5}{4},\ x_2 = 4.$$

Праверка паказвае, што коранем ураўнення (4) (а значыць, і ўраўнення (2)) з'яўляецца значэнне $x = \frac{5}{4}$.

б) Відавочна, што $x=-7$ ператварае ўраўненне (3) у правільную лікавую роўнасць і належыць абсягу вызначэння ўраўнення (3) — мноству $D=(-\infty;\ 5]$. Значыць, $x=-7$ — корань ураўнення (3).

Пры $x\neq -7$ ураўненне (3) раўназначна ўраўненню

$$\sqrt{5-x} = 9-2x. \tag{5}$$

Рашыўшы яго, атрымаем:

$$\sqrt{5-x} = 9-2x \Leftrightarrow \begin{cases} 5-x=(9-2x)^2, \\ 9-2x\geqslant 0 \end{cases} \Leftrightarrow$$

$$\Leftrightarrow \begin{cases} \left(x=4 \text{ або } x=4\frac{3}{4}\right), \\ x\leqslant 4{,}5 \end{cases} \Leftrightarrow x=4.$$

Адказ: а) 1,25; б) –7; 4.

Рашэнне ўраўнення (3) з дапамогай знакаў раўназначнасці можна запісаць так:

$$(x+7)\sqrt{5-x} = (9-2x)(x+7) \Leftrightarrow$$

$$\Leftrightarrow \left(\begin{cases} x+7=0, \\ 5-x \geqslant 0 \end{cases} \text{або } \sqrt{5-x} = 9-2x\right) \Leftrightarrow$$

$$\Leftrightarrow \left(\begin{cases} x=-7, \\ x \leqslant 5 \end{cases} \text{ або } \begin{cases} 5-x=(9-2x)^2, \\ 9-2x \geqslant 0 \end{cases}\right) \Leftrightarrow$$

$$\Leftrightarrow \left(x=-7 \text{ або } \begin{cases} \left(x=4 \text{ або } x=4\frac{3}{4}\right), \\ x \leqslant 4{,}5 \end{cases}\right) \Leftrightarrow$$

$$\Leftrightarrow (x=-7 \text{ або } x=4).$$

Прыклад 4. Рашыць ураўненне:

а) $1-\sqrt{x^2-16} = \sqrt[6]{8x-2x^2} + 3x$;

б) $12+\sqrt[4]{x^2-16} = \sqrt[10]{8x-2x^2} + 3x$.

Рашэнне. а) Паколькі функцыя $f(x)=1-\sqrt{x^2-16}$ вызначана для значэнняў x, што задавальняюць няроўнасць $x^2-16 \geqslant 0$, а функцыя $g(x)=\sqrt[6]{8x-2x^2}+3x$ вызначана для значэнняў x, што задавальняюць няроўнасць $8x-2x^2 \geqslant 0$, то абсяг вызначэння дадзенага ўраўнення супадае з мноствам рашэнняў сістэмы няроўнасцей

$$\begin{cases} x^2-16 \geqslant 0, \\ 8x-2x^2 \geqslant 0. \end{cases}$$

Рашаючы гэтую сістэму, атрымліваем раўназначную ёй сістэму:

$$\begin{cases} x^2 \geqslant 16, \\ 2x(x-4) \leqslant 0, \end{cases}$$

адкуль маем

$$\begin{cases} (x \leqslant -4 \text{ або } x \geqslant 4), \\ 0 \leqslant x \leqslant 4. \end{cases}$$



Рыс. 21

На рысунку 21 бачна, што рашэннем гэтай сістэмы з'яўляецца толькі значэнне $x=4$. Значыць, абсяг вызначэння ўраўнення складаецца з адзінага ліку 4, г. зн. $D=\{4\}$.

Засталося праверыць, ці з'яўляецца лік 4 коранем дадзенага ўраўнення. Падставіўшы $x = 4$ у зыходнае ўраўненне, атрымаем

$$1 - \sqrt{4^2 - 16} = \sqrt[6]{8 \cdot 4 - 2 \cdot 16} + 3 \cdot 4,$$

г. зн. $1 = 12$ — няправільную лікавую роўнасць, таму 4 не з'яўляецца коранем дадзенага ўраўнення.

б) Рашэнне гэтага прыкладу аналагічна рашэнню прыкладу а). Выканайце яго самастойна.

Адказ: а) няма каранёў; б) 4.

Прыклад 5. Рашыць ураўненне

$$\sqrt{x - 7} - \sqrt[4]{1 - 2x} = 3x - 8.$$

Рашэнне. Абсяг вызначэння дадзенага ўраўнення супадае з мноствам рашэнняў сістэмы няроўнасцей:

$$\begin{cases} x - 7 \geqslant 0, \\ 1 - 2x \geqslant 0 \end{cases} \Leftrightarrow \begin{cases} x \geqslant 7, \\ x \leqslant \frac{1}{2}, \end{cases} \Leftrightarrow x \in \varnothing.$$

Паколькі сістэма не мае рашэнняў, то абсяг вызначэння не змяшчае ні аднаго ліку. Значыць, дадзенае ўраўненне не мае каранёў.

Адказ: няма каранёў.

Часам пры рашэнні ўраўненняў бывае карысна звярнуць увагу на найбольшае або найменшае значэнні функцый, што ўваходзяць у іх.

Прыклад 6. Рашыць ураўненне

$$\sqrt{36 + \sqrt{4 - x^2}} = 11.$$

Рашэнне. Абсяг вызначэння ўраўнення супадае з мноствам рашэнняў няроўнасці $4 - x^2 \geqslant 0$, г. зн. $D = [-2;\ 2]$.

Відавочна, што функцыя $f(x) = \sqrt{36 + \sqrt{4 - x^2}}$ мае найбольшае значэнне $\sqrt{38}$ пры $x = 0$. Такім чынам, пры любых значэннях $x \in [-2;\ 2]$ будзе правільнай няроўнасць $f(x) \leqslant \sqrt{38}$, але $\sqrt{38} < 11$, таму дадзенае ва ўмове ўраўненне рашэнняў не мае.

Адказ: няма рашэнняў. ▲

1. Якое мноства D называюць абсягам вызначэння ўраўнення $f(x) = g(x)$?

2. У якім выпадку ўраўненне $f(x) = g(x)$ мае не больш за адзін корань?

3*. Ці правільна, што лік x_0 з'яўляецца коранем ураўнення $f(x) = g(x)$, вызначанага на мностве D, калі:

а) $x_0 \notin D$; б) $x_0 \in D$; в) $f(x_0) = g(x_0)$?

Практыкаванні

Рашыце ўраўненне (**1.249—1.257**).

1.249. 1) $\sqrt{3x+7} = 7 - x$; 2) $\sqrt{5+2x} = 5 - x$;

3) $\sqrt{x+1} = 11 - x$; 4) $\sqrt{x+3} = 17 - x$;

5) $\sqrt{2-x} = 4x - 3$; 6) $\sqrt{3-x} = 2x - 3$.

1.250*. 1) $\sqrt[10]{3x-5} = \sqrt[3]{17-8x}$;

2) $\sqrt[6]{9x-17} = \sqrt[5]{7-3x}$;

3) $\sqrt[4]{13-4x} = \sqrt[7]{4x-11}$;

4) $\sqrt[8]{5x-19} = \sqrt[11]{5-x}$;

5) $\sqrt[8]{3-x} = \sqrt[7]{-x^2+7x-12}$;

6) $\sqrt[4]{2x+3} = \sqrt[5]{-2x^2-7x-6}$;

7) $\sqrt[12]{x^2+3x-10} = \sqrt[7]{4-x^2}$;

8) $\sqrt[10]{x^2+2x-8} = \sqrt[13]{4-x^2}$.

1.251*. 1) $\sqrt[7]{2x^2-3x-77} \cdot \sqrt{x^3-x} = 0$;

2) $\sqrt[8]{3x^2-7x-20} \cdot \sqrt[3]{x^2-x-2} = 0$;

3) $\sqrt[9]{\sqrt{x+2}\,(x-4)} \cdot \sqrt[4]{x^4-27x} = 0$;

4) $\sqrt[11]{|x+4|\sqrt{x+5}} \cdot \sqrt[6]{x^6-32x} = 0$;

5) $\sqrt[5]{x^3-3x^2+3x-1} \cdot \sqrt[6]{x^2-2x-15} = 0$;

6) $\sqrt[13]{8x^3-36x^2+54x-27} \cdot \sqrt[10]{\sqrt{2-3x} \cdot (x+5)} = 0$.

1.252*. 1) $\sqrt{x-1}+\sqrt{x+3}=3-x$;

2) $2\sqrt{x}+\sqrt{x-3}=9-x$;

3) $\sqrt{2x+3}-\sqrt{4-x}=\sqrt{7-x}$;

4) $\sqrt{7+3x}-\sqrt{5-4x}=1-2\sqrt{x+2}$.

1.253*. 1) $(x+4)\sqrt{2x-4}=(x+4)(x-1)$;

2) $(3x-36)\sqrt{7-x}=(x-1)(3x-36)$;

3) $(2x-30)\sqrt{8-x}=(4-2x)(x-15)$;

4) $(3x+18)\sqrt{x-3}=(x-9)(3x+18)$;

5) $(x-4)\sqrt{|x-2|+5}=(1-x)(x-4)$;

6) $(x+4)\sqrt{3-|x+3|}=(x+4)(x+2)$.

1.254*. 1) $(x+3)\left(\sqrt[4]{x}+\sqrt{x}\right)=2x+6$;

2) $(x-5)\left(\sqrt[3]{x}+2\sqrt[6]{x}\right)=3x-15$.

1.255*. 1) $5-\sqrt{x^2-25}=\sqrt[6]{15x-3x^2}+x$;

2) $8-\sqrt[8]{x^2-4}=\sqrt[4]{-2x-x^2}-4x$;

3) $\sqrt[8]{x^2-49}+x=\sqrt{7x-x^2}+7$;

4) $\sqrt{3x-x^2}-2x+6=\sqrt{x^2-9}$;

5) $-28-\sqrt[4]{49-x^2}=\sqrt[6]{-63-16x-x^2}+4x$;

6) $4-\sqrt{x^2-64}=\sqrt[6]{8+7x-x^2}+0{,}5x$.

1.256*. 1) $3-\sqrt[10]{|x+4|-6}=\sqrt[6]{3-|2x-1|}+1{,}5x$;

2) $5-\sqrt[6]{|x+2|-4}=\sqrt[10]{1-|x-1|}+2{,}5x$;

3) $8-\sqrt[4]{|2x-3|-5}=\sqrt[16]{|x-5|-1}+2x$;

4) $12-\sqrt[8]{8-|3x+1|}=\sqrt{6-|x+9|}-4x$.

1.257*. 1) $\sqrt[6]{x-4}+\sqrt[8]{3-x}=x+9$;

2) $\sqrt[10]{x-9}-\sqrt[8]{6-2x}=5x-2$;

3) $\sqrt{x-6}-\sqrt[6]{3x-x^2}=4x-16$;

4) $\sqrt[8]{5x-20}+\sqrt[4]{x-x^2}=6x+1$.

1.15. Ірацыянальныя няроўнасці

У гэтым пункце мы будзем разглядаць няроўнасці, якія змяшчаюць зменную (невядомае) пад знакам кораня. Такія няроўнасці называюцца ***ірацыянальнымі***.

Пры рашэнні ірацыянальных няроўнасцей часта выкарыстоўваюць падыход, які мы ўжо прымянялі пры рашэнні ірацыянальных ураўненняў. Яго сутнасць — замена зыходнай няроўнасці раўназначнай ёй няроўнасцю (сістэмай або сукупнасцю няроўнасцей).

Прыклад 1. Рашыць няроўнасць:

а) $\sqrt[7]{2x-5} > -1$; б) $\sqrt[4]{3x+8} \geqslant -6$.

Рашэнне. а) З улікам уласцівасцей кораня няцотнай ступені атрымліваем:

$$\sqrt[7]{2x-5} > -1 \Leftrightarrow 2x-5 > (-1)^7 \Leftrightarrow x > 2.$$

б) Па азначэнні кораня цотнай ступені значэнні выразу $\sqrt[4]{3x+8}$ неадмоўныя пры ўсіх значэннях x, пры якіх гэты выраз мае сэнс, г. зн. калі значэнні падкарэннага выразу неадмоўныя. Такім чынам, маем:

$$\sqrt[4]{3x+8} \geqslant -6 \Leftrightarrow 3x+8 \geqslant 0 \Leftrightarrow x \geqslant -2\frac{2}{3}.$$

Адказ: а) $(2; +\infty)$; б) $\left[-2\frac{2}{3}; +\infty\right)$.

Прыклад 2. Рашыць няроўнасць:

а) $\sqrt[10]{11-4x} \leqslant 0$; б) $\sqrt[6]{21-2x} \leqslant 1$.

Рашэнне. а) Па азначэнні кораня цотнай ступені значэнні выразу $\sqrt[10]{11-4x}$ адмоўнымі быць не могуць. Таму маем:

$$\sqrt[10]{11-4x} \leqslant 0 \Leftrightarrow \sqrt[10]{11-4x} = 0 \Leftrightarrow 11-4x = 0 \Leftrightarrow x = \frac{11}{4}.$$

б) Паколькі абедзве часткі няроўнасці $\sqrt[6]{21-2x} \leqslant 1$ неадмоўныя пры ўсіх значэннях x, пры якіх яго левая частка мае сэнс, то маем:

$$\sqrt[6]{21-2x} \leqslant 1 \Leftrightarrow \begin{cases} 21-2x \geqslant 0, \\ 21-2x \leqslant 1^6 \end{cases} \Leftrightarrow \begin{cases} x \leqslant \frac{21}{2}, \\ x \geqslant \frac{20}{2} \end{cases} \Leftrightarrow 10 \leqslant x \leqslant 10{,}5.$$

Адказ: а) $x = 2\frac{3}{4}$; б) $[10; 10{,}5]$.

Пры рашэнні ірацыянальных няроўнасцей часта выкарыстоўваецца таксама метад інтэрвалаў.

Прыклад 3. Рашыць няроўнасць $\sqrt{2x+3} \leqslant 3-2x$.

Рашэнне. Абазначым $f(x)=\sqrt{2x+3}+2x-3$. Знойдзем абсяг вызначэння функцыі f:

$$2x+3 \geqslant 0 \Leftrightarrow x \geqslant -1{,}5.$$

Такім чынам, $D(f)=[-1{,}5;\ +\infty)$.

Знойдзем нулі функцыі f, г. зн. карані ўраўнення $f(x)=0$:

$$f(x)=0 \Leftrightarrow \sqrt{2x+3}+2x-3=0 \Leftrightarrow \sqrt{2x+3}=3-2x \Leftrightarrow$$
$$\Leftrightarrow 2x+3=(3-2x)^2 \Leftrightarrow 2x^2-7x+3=0 \Leftrightarrow (x=0{,}5 \text{ або } x=3).$$

Праверка: $f(0{,}5)=\sqrt{2\cdot 0{,}5+3}+2\cdot 0{,}5-3=0;$

$$f(3)=\sqrt{2\cdot 3+3}+2\cdot 3-3=6.$$

Значыць, 0,5 — адзіны нуль функцыі f.

Адзначым нуль функцыі f на абсягу вызначэння $D(f)$ (рыс. 22). Вызначым знакі значэнняў функцыі f на атрыманых інтэрвалах, для чаго вылічым:

$$f(0)=\sqrt{3}-3<0;$$
$$f(1)=\sqrt{5}-1>0.$$



Рыс. 22

Выкарыстаўшы рысунак 22, запішам рашэнне няроўнасці $f(x)\leqslant 0$: $x\in[-1{,}5;\ 0{,}5]$.

Адказ: $[-1{,}5;\ 0{,}5]$

Прыклад 4. Рашыць няроўнасць $\sqrt{2x+3} > 3-2x$.

Рашэнне. Рашэнне гэтага прыкладу даслоўна паўтарае рашэнне прыкладу 3.

Выкарыстаўшы рысунак 22, запішам рашэнне няроўнасці $f(x)>0$: $x\in(0{,}5;\ +\infty)$.

Адказ: $(0{,}5;\ +\infty)$.

▲ Пры рашэнні ірацыянальных няроўнасцей часта выкарыстоўваюцца наступныя сцверджанні аб раўназначнасці няроўнасцей і сістэм няроўнасцей:

$$\sqrt{f(x)} \leqslant g(x) \Leftrightarrow \begin{cases} f(x)\leqslant g^2(x),\\ f(x)\geqslant 0,\\ g(x)\geqslant 0; \end{cases} \qquad (1)$$

$$\sqrt{f(x)} > g(x) \Leftrightarrow \left(\begin{cases} g(x) \geqslant 0, \\ f(x) > g^2(x) \end{cases} \text{або} \begin{cases} g(x) < 0, \\ f(x) \geqslant 0 \end{cases} \right). \qquad (2)$$

Рэшым прыклад 3, выкарыстаўшы раўназначнасць (1):

$$\sqrt{2x+3} \leqslant 3-2x \Leftrightarrow \begin{cases} 2x+3 \leqslant (3-2x)^2, \\ 2x+3 \geqslant 0, \\ 3-2x \geqslant 0 \end{cases} \Leftrightarrow \begin{cases} 2x^2-7x+3 \geqslant 0, \\ x \geqslant -1{,}5, \\ x \leqslant 1{,}5 \end{cases} \Leftrightarrow$$

$$\Leftrightarrow \begin{cases} 2(x-0{,}5)(x-3) \geqslant 0, \\ x \geqslant -1{,}5, \\ x \leqslant 1{,}5 \end{cases} \Leftrightarrow \begin{cases} x \leqslant 0{,}5 \text{ або } x \geqslant 3, \\ x \geqslant -1{,}5, \\ x \leqslant 1{,}5 \end{cases} \Leftrightarrow -1{,}5 \leqslant x \leqslant 0{,}5.$$

Адказ: $[-1{,}5;\ 0{,}5]$.

Рэшым прыклад 4, выкарыстаўшы раўназначнасць (2):

$$\sqrt{2x+3} > 3-2x \Leftrightarrow \left(\begin{cases} 3-2x \geqslant 0, \\ 2x+3 > (3-2x)^2 \end{cases} \text{або} \begin{cases} 3-2x < 0, \\ 2x+3 \geqslant 0 \end{cases} \right) \Leftrightarrow$$

$$\Leftrightarrow \left(\begin{cases} x \leqslant 1{,}5, \\ 2x^2-7x+3 < 0 \end{cases} \text{або} \begin{cases} x > 1{,}5, \\ x \geqslant -1{,}5 \end{cases} \right) \Leftrightarrow$$

$$\Leftrightarrow \left(\begin{cases} x \leqslant 1{,}5, \\ 0{,}5 < x < 3 \end{cases} \text{або } x > 1{,}5 \right) \Leftrightarrow x > 0{,}5.$$

Адказ: $(0{,}5;\ +\infty)$.

Для рашэння заданняў такога тыпу, як, напрыклад, у практыкаванні 1.265, можна выкарыстоўваць наступныя сцверджанні аб раўназначнасці:

$$\sqrt{f(x)} \leqslant \sqrt{g(x)} \Leftrightarrow \begin{cases} f(x) \leqslant g(x), \\ f(x) \geqslant 0; \end{cases} \qquad (3)$$

$$\sqrt{f(x)} > \sqrt{g(x)} \Leftrightarrow \begin{cases} f(x) > g(x), \\ g(x) \geqslant 0. \end{cases} \qquad (4)$$

Аналагічныя сцверджанні можна запісаць і для няроўнасцей $\sqrt{f(x)} < \sqrt{g(x)}$, $\sqrt{f(x)} \geqslant \sqrt{g(x)}$. ▲

1. Якія няроўнасці называюцца ірацыянальнымі?

2. Апішыце падыходы да рашэння няроўнасцей выгляду:

а) $\sqrt[4]{f(x)} > 5$; б) $\sqrt[5]{f(x)} \leqslant 2$; в) $\sqrt[3]{f(x)} \leqslant -3$.

3*. Запішыце сцверджанні аб раўназначнасці для няроўнасцей:

а) $\sqrt{f(x)} < g(x)$; б) $\sqrt{f(x)} \geqslant g(x)$;

в) $\sqrt{f(x)} < \sqrt{g(x)}$; г) $\sqrt{f(x)} \geqslant \sqrt{g(x)}$.

Практыкаванні

Рашыце няроўнасць (**1.258—1.266**).

1.258°. 1) $\sqrt{x-1} > 2$; 2) $\sqrt{x+2} > 3$;
3) $\sqrt{x-1} < 2$; 4) $\sqrt{x+2} < -3$;
5) $\sqrt{x-1} > -2$; 6) $\sqrt{x+2} > -3$;
7) $\sqrt{x-1} < -2$; 8) $\sqrt{x+2} < 3$.

1.259°. 1) $\sqrt{x^2-9} \leqslant -1$; 2) $\sqrt{x^4-16} < -5$;
3) $\sqrt{x^2-8} \leqslant 0$; 4) $\sqrt{x^4-32} \leqslant 0$;
5) $\sqrt{x^2} > 0$; 6) $\sqrt{x^2} < 0$;
7) $\sqrt{x^2} < 4$; 8) $\sqrt{x^2} > 9$;
9) $\sqrt{x^2} \geqslant 0$; 10) $\sqrt{x^2} \leqslant 0$.

1.260°. 1) $\sqrt{x^2+x-2} < 2$; 2) $\sqrt{x^2-5x+4} < 2$;
3) $\sqrt{11+6x-5x^2} > -1$; 4) $\sqrt{-x^2-3x+4} > -2$.

1.261°. 1) $\sqrt{2-\sqrt{x}} > 1$; 2) $\sqrt{3-\sqrt{x}} > 2$;
3) $\sqrt{4+\sqrt{x}} < 3$; 4) $\sqrt{6+\sqrt{x}} < 1$.

1.262. 1) $\frac{\sqrt{x}-3}{\sqrt{x}+2} < 0$; 2) $\frac{\sqrt{x}+5}{\sqrt{x}-1} > 0$; 3) $\frac{4+\sqrt{x}}{6-\sqrt{x}} > 0$;
4) $\frac{2-\sqrt{x}}{7+\sqrt{x}} < 0$; 5) $\frac{\sqrt{x}-10}{2-\sqrt{x}} \leqslant 0$; 6) $\frac{\sqrt{x}+2}{3-\sqrt{x}} \geqslant 0$;
7) $\frac{\sqrt{x}}{7-\sqrt{x}} \geqslant 0$; 8) $\frac{\sqrt{x}+4}{\sqrt{x}} \leqslant 0$.

1.263. 1) $(x-1)\sqrt{x} \leqslant 0$; 2) $(x-2)\sqrt{x} \leqslant 0$;
3) $(x-1)\sqrt{x} \geqslant 0$; 4) $(x-2)\sqrt{x} \geqslant 0$;
5) $(x-1)\sqrt{x} < 0$; 6) $(x-2)\sqrt{x} < 0$;
7) $(x-1)\sqrt{x} > 0$; 8) $(x-2)\sqrt{x} > 0$.

1.264. 1) $(x+10)\sqrt{x-4} \leqslant 0$; 2) $(x+8)\sqrt{x-2} \leqslant 0$;
3) $(x-12)\sqrt{x-3} \leqslant 0$; 4) $(x-6)\sqrt{x-1} \leqslant 0$;
5)* $(x^2-4)\sqrt{x-1} \leqslant 0$; 6)* $(x^2-9)\sqrt{x-3} \leqslant 0$;
7)* $(x+2)\sqrt{(4-x)(5-x)} \geqslant 0$;
8) $(x+1)\sqrt{(x+4)(x+7)} \leqslant 0$.

1.265*. 1) $\sqrt{x+2} > \sqrt{x-1}$; 2) $\sqrt{x-2} > \sqrt{3-x}$;
3) $\sqrt{x+3} > \sqrt{1-x}$; 4) $\sqrt{5x+7} < \sqrt{2-3x}$;
5) $\sqrt{3-7x} \geqslant \sqrt{6x-8}$; 6) $\sqrt{5-2x} \leqslant \sqrt{3x-9}$;
7) $\sqrt{5-x} \leqslant \sqrt{x+1}$; 8) $\sqrt{8-x} \geqslant \sqrt{x+2}$.

1.266*. 1) $\sqrt{x-3} < x-2$; 2) $\sqrt{x-2} > x$;
3) $\sqrt{12+x} > x$; 4) $\sqrt{x+6} > x$;
5) $\sqrt{5x-x^2} > x-2$; 6) $\sqrt{5x-x^2} < x-2$;
7) $\sqrt{10-x^2} > 3x$; 8) $\sqrt{x^2+5x+7} < 3-x$.

Раздзел 2
Паказальная і лагарыфмічная функцыі

2.1. Ступень з рэчаісным паказчыкам

Мы ўжо ведаем, што такое ступень з рацыянальным паказчыкам. Цяпер вызначым ступень з ірацыянальным паказчыкам пры аснове $a > 0$. Зробім гэта спачатку для асновы $a > 1$.

Няхай s — ірацыянальны лік. Возьмем такія рацыянальныя лікі r і t, што

$$r < s < t.$$

Тады па ўласцівасці ступені з рацыянальным паказчыкам $a^r < a^t$. Будзе натуральна вызначыць ступень a^s так, каб гэты лік задавальняў няроўнасць

$$a^r < a^s < a^t.$$

Менавіта так мы і зробім.

Азначэнне. **Няхай $a > 1$. *Ступенню ліку a з ірацыянальным паказчыкам s* называецца такі лік b, што**

$$a^r < b < a^t$$

пры любых рацыянальных значэннях r і t, што задавальняюць няроўнасць

$$r < s < t.$$

Гэты лік b абазначаецца a^s.

! Сцверджанне аб існаванні і адзінасці такога ліку b мы прымаем без доказу.

Аналагічна для дадатнага ліку $a < 1$.

Азначэнне. **Няхай $0 < a < 1$. *Ступенню ліку a з ірацыянальным паказчыкам s* называецца такі лік b, што**

$$a^t < b < a^r$$

пры любых рацыянальных значэннях r і t, што задавальняюць няроўнасць

$$r < s < t.$$

Гэты лік b абазначаецца a^s.

Сцверджанне аб існаванні і адзінасці такога ліку b мы прымаем без доказу.

Нарэшце, вызначым ступень з асновай 1.

Азначэнне. **Для любога ірацыянальнага ліку s**

$$1^s = 1.$$

Такім чынам, *пры дадатнай аснове паняцце ступені вызначана для любога рацыянальнага і для любога ірацыянальнага паказчыка*, г. зн. ***для любога рэчаіснага паказчыка***. Пры гэтым усе дзеянні са ступенямі з адвольнымі рэчаіснымі паказчыкамі валодаюць тымі ж уласцівасцямі, што і дзеянні са ступенямі з рацыянальнымі паказчыкамі. Гэтыя ўласцівасці мы сфармулюем у наступнай тэарэме, якую прымем без доказу.

Тэарэма. Для любых значэнняў $a > 0$ і $b > 0$ пры любых рэчаісных s і t правільныя роўнасці:

$$a^s a^t = a^{s+t}; \quad (1)$$

$$\frac{a^s}{a^t} = a^{s-t}; \quad (2)$$

$$(a^s)^t = a^{st}; \quad (3)$$

$$(ab)^s = a^s b^s; \quad (4)$$

$$\left(\frac{a}{b}\right)^s = \frac{a^s}{b^s}. \quad (5)$$

Прыклад 1. Размясціць у парадку спадання лікі:

а) $0{,}63^3$, $0{,}63^{3{,}5}$, $0{,}63^{\sqrt{11}}$; б) $11{,}7^{1{,}4}$, $11{,}7^{1{,}7}$, $11{,}7^{\frac{\pi}{2}}$.

Рашэнне. а) Параўнаем лікі 3; 3,5 і $\sqrt{11}$. Паколькі $3 = \sqrt{9}$, $3{,}5 = \sqrt{12{,}25}$, а $\sqrt{9} < \sqrt{11} < \sqrt{12{,}25}$, то

$$3 < \sqrt{11} < 3{,}5.$$

Значыць, па азначэнні ступені з ірацыянальным паказчыкам пры аснове 0,63 атрымаем правільную няроўнасць

$$0{,}63^{3{,}5} < 0{,}63^{\sqrt{11}} < 0{,}63^3.$$

б) Параўнаем лікі 1,4; 1,7 і $\frac{\pi}{2}$. Паколькі $\frac{\pi}{2} \approx \frac{3{,}14}{2} = 1{,}57$, то

$$1{,}4 < \frac{\pi}{2} < 1{,}7.$$

Значыць, па азначэнні ступені з ірацыянальным паказчыкам пры аснове 11,7 атрымаем правільную няроўнасць

$$11{,}7^{1{,}4} < 11{,}7^{\frac{\pi}{2}} < 11{,}7^{1{,}7}.$$

Адказ: а) $0{,}63^3$; $0{,}63^{\sqrt{11}}$; $0{,}63^{3{,}5}$; б) $11{,}7^{1{,}7}$; $11{,}7^{\frac{\pi}{2}}$; $11{,}7^{1{,}4}$.

Прыклад 2. Выкарыстаўшы азначэнне ступені з ірацыянальным паказчыкам, запісаць па тры правільныя двайныя няроўнасці для ступені a^s, калі: а) $a = 4$; $s = \sqrt{13}$; б) $a = \frac{5}{7}$; $s = \pi$.

Рашэнне. а) Запішам тры правільныя двайныя няроўнасці спачатку для паказчыка $s = \sqrt{13}$:

$$\sqrt{9} < \sqrt{13} < \sqrt{16}, \quad \text{г. зн.} \quad 3 < \sqrt{13} < 4;$$
$$\sqrt{12{,}25} < \sqrt{13} < \sqrt{13{,}69}, \quad \text{г. зн.} \quad 3{,}5 < \sqrt{13} < 3{,}7;$$
$$\sqrt{12{,}96} < \sqrt{13} < \sqrt{13{,}69}, \quad \text{г. зн.} \quad 3{,}6 < \sqrt{13} < 3{,}7.$$

Па азначэнні ступені з ірацыянальным паказчыкам пры аснове $4 > 1$ будуць правільныя і няроўнасці:

$$4^3 < 4^{\sqrt{13}} < 4^4;$$
$$4^{3{,}5} < 4^{\sqrt{13}} < 4^{3{,}7};$$
$$4^{3{,}6} < 4^{\sqrt{13}} < 4^{3{,}7}.$$

б) Запішам тры правільныя двайныя няроўнасці спачатку для паказчыка $s = \pi$. Паколькі $\pi \approx 3{,}1415$, то маем:

$$3 < \pi < 4;$$
$$3{,}1 < \pi < 3{,}2;$$
$$3{,}14 < \pi < 3{,}15.$$

Па азначэнні ступені з ірацыянальным паказчыкам пры аснове $0 < \frac{5}{7} < 1$ будуць правільныя і няроўнасці:

$$\left(\frac{5}{7}\right)^4 < \left(\frac{5}{7}\right)^\pi < \left(\frac{5}{7}\right)^3;$$
$$\left(\frac{5}{7}\right)^{3{,}2} < \left(\frac{5}{7}\right)^\pi < \left(\frac{5}{7}\right)^{3{,}1};$$
$$\left(\frac{5}{7}\right)^{3{,}15} < \left(\frac{5}{7}\right)^\pi < \left(\frac{5}{7}\right)^{3{,}14}.$$

?

1. Сфармулюйце азначэнне ступені ліку a з ірацыянальным паказчыкам s, калі:
а) $a > 1$; б) $0 < a < 1$; в) $a = 1$.
2. Сфармулюйце азначэнне ступені дадатнага ліку a для выпадкаў, калі паказчык:
а) натуральны лік, большы за 1; б) 1; в) 0; г) адмоўны лік; д) рацыянальны лік выгляду $\frac{m}{n}$, $m \in \boldsymbol{Z}$, $n \in \boldsymbol{N}$, $n \geqslant 2$; е) любы ірацыянальны лік.
3. Сфармулюйце тэарэму аб дзеяннях над ступенямі з адвольнымі рэчаіснымі паказчыкамі.

Практыкаванні

2.1°. Размясціце ў парадку нарастання лікі:

1) $0{,}7^{1{,}5}$; $0{,}7^{2}$; $0{,}7^{\sqrt{2}}$; $0{,}7^{0{,}2}$;
2) $3{,}4^{2{,}7}$; $3{,}4^{\sqrt{5}}$; $3{,}4^{3}$; $3{,}4^{2{,}2}$;
3) $4{,}1^{2{,}2}$; $4{,}1^{\sqrt{10}}$; $4{,}1^{3{,}5}$; $4{,}1^{3}$;
4) $0{,}2^{1{,}7}$; $0{,}2^{\sqrt{3}}$; $0{,}2^{3{,}9}$; $0{,}2^{1{,}5}$;
5) $\left(\frac{1}{4}\right)^{-\frac{1}{3}}$; $2^{-0{,}5}$; $4^{\frac{2}{3}}$; $8^{\frac{\sqrt{3}}{6}}$;
6) $\left(\sqrt{5}\right)^{-\frac{1}{2}}$; $5^{\frac{1}{3}}$; $25^{-\frac{\sqrt{19}}{6}}$; $\left(\frac{1}{125}\right)^{\sqrt{0{,}1}}$.

2.2°. Выкарыстаўшы азначэнне ступені з ірацыянальным паказчыкам, запішыце па тры правільныя двайныя няроўнасці для a^s, калі:

1) $a = 3$; $s = \sqrt{2}$;
2) $a = 0{,}7$; $s = \sqrt{3}$;
3) $a = 0{,}1$; $s = \frac{\pi}{3}$;
4) $a = 5$; $s = \frac{\pi}{2}$;
5) $a = \arcsin\frac{1}{2}$; $s = \sqrt{5}$;
6) $a = \arccos\frac{\sqrt{2}}{2}$; $s = \sqrt{7}$.

2.3. Параўнайце лікі:

1) $2^{\sin\frac{\pi}{3}}$ і $2^{\sqrt{3}}$;
2) $4^{\operatorname{tg}\frac{\pi}{3}}$ і $4^{\sqrt{2}}$;
3) $3{,}5^{-\operatorname{ctg}\frac{\pi}{6}}$ і 1;
4) 1 і $0{,}8^{-\operatorname{tg}\frac{\pi}{6}}$;
5) $3^{\operatorname{tg}\frac{\pi}{4}}$ і $3^{\sin\frac{\pi}{4}}$;
6) $7^{\sin\frac{\pi}{4}}$ і $7^{\cos\frac{\pi}{6}}$;
7) $0{,}11^{\operatorname{ctg}\frac{\pi}{2}}$ і $0{,}11^{\operatorname{tg}0}$;
8) $0{,}17^{\operatorname{ctg}\frac{\pi}{4}}$ і $0{,}17^{\operatorname{ctg}\frac{\pi}{3}}$.

Спрасціце (**2.4—2.9**).

2.4. 1) $\sqrt[4]{3^{(\sqrt{3}+1)^2}\cdot 9^{-\sqrt{3}}}$; 2) $\sqrt[3]{5^{(\sqrt{5}+1)^2}\cdot 25^{-\sqrt{5}}}$;

3) $\left(\left(\frac{1}{2}\right)^{\sqrt{2}}\right)^{-\sqrt{2}}$; 4) $\left(\left(\frac{1}{3}\right)^{-\sqrt{3}}\right)^{\sqrt{3}}$;

5) $\left(\left(\sqrt{6}\right)^{\sqrt{2}}\right)^{\sqrt{2}}$; 6) $\left(\left(\sqrt{2}\right)^{\sqrt{6}}\right)^{\sqrt{6}}$;

7) $2^{(\sqrt{2}+1)^2} : 4^{\sqrt{2}}$; 8) $3^{(\sqrt{3}-1)^2} : \left(\frac{1}{3}\right)^{2\sqrt{3}}$.

2.5. 1) $2^{\sin^2\frac{\pi}{5}}\cdot 2^{\cos^2\frac{\pi}{5}}$; 2) $\left(3^{\operatorname{tg}\frac{\pi}{7}}\right)^{\operatorname{ctg}\frac{\pi}{7}}$;

3) $\left(4^{2\sin\frac{\pi}{12}}\right)^{\cos\frac{\pi}{12}}$; 4) $\left(0{,}5^{2\operatorname{tg}\frac{\pi}{8}}\right)^{\frac{1}{1-\operatorname{tg}^2\frac{\pi}{8}}}$;

5) $5^{\cos^2\frac{\pi}{6}} : 5^{\sin^2\frac{\pi}{6}}$; 6) $0{,}09\cdot 0{,}09^{\cos\frac{2\pi}{3}}$;

7) $0{,}04 : 0{,}04^{\cos 120°}$; 8) $0{,}13^{\cos^2\frac{\pi}{13}}\cdot 0{,}13^{\sin^2\frac{\pi}{13}}$;

9) $49^{\cos^2 30°} : 49^{\sin^2 30°}$; 10) $\left(16^{2\cos 15°}\right)^{\sin 15°}$.

2.6. 1) $4^{\arcsin\frac{1}{2}}\cdot 4^{\arccos\frac{\sqrt{3}}{2}}\cdot 4^{\operatorname{arctg} 0} : 4^{\arccos(-1)}$;

2) $7^{\arccos\frac{1}{2}}\cdot 7^{\arcsin\frac{\sqrt{3}}{2}}\cdot 7^{\operatorname{arctg} 1} : 7^{\arcsin 1+\pi}$;

3) $\left(0{,}2^{\arccos\left(-\frac{1}{2}\right)}\right)^{\frac{3}{\pi}} + \left(0{,}96^{\operatorname{arctg}(-1)}\right)^{-\frac{4}{\pi}}$;

4) $\left(0{,}64^{\arcsin\left(-\frac{1}{2}\right)}\right)^{-\frac{6}{\pi}} + \left(0{,}6^{\operatorname{arcctg}(-1)}\right)^{\frac{8}{3\pi}}$.

2.7. 1) $\dfrac{m^{2\sqrt{2}}-n^{2\sqrt{2}}}{\left(m^{\sqrt{2}}-n^{\sqrt{2}}\right)^2}+1$; 2) $1-\dfrac{\left(m^{\sqrt{3}}+n^{\sqrt{3}}\right)^2}{m^{2\sqrt{3}}-n^{2\sqrt{3}}}$;

3) $\dfrac{m^{2\sqrt{8}}-m^{\sqrt{8}}}{m^{\sqrt{8}}}-m^{\sqrt{8}}$;

4) $\dfrac{n^{3\sqrt{10}}+n^{2\sqrt{10}}}{n^{2\sqrt{10}}}-n^{\sqrt{10}}$;

5) $\dfrac{m^{2\sqrt{3}}-n^{2\sqrt{3}}}{m^{2\sqrt{3}}+n^{2\sqrt{3}}+2m^{\sqrt{3}}n^{\sqrt{3}}}\cdot\left(m^{\sqrt{3}}+n^{\sqrt{3}}\right)^2$;

6) $\dfrac{m^{2\sqrt{5}}-n^{2\sqrt{5}}}{m^{2\sqrt{5}}+n^{2\sqrt{5}}-2m^{\sqrt{5}}n^{\sqrt{5}}}\cdot\left(m^{\sqrt{5}}-n^{\sqrt{5}}\right)^2$.

2.8*. 1) $\dfrac{m^{3\sqrt{6}}-n^{3\sqrt{6}}}{m^{2\sqrt{6}}+m^{\sqrt{6}}n^{\sqrt{6}}+n^{2\sqrt{6}}}$; 2) $\dfrac{m^{3\sqrt{10}}+n^{3\sqrt{10}}}{m^{2\sqrt{10}}-m^{\sqrt{10}}n^{\sqrt{10}}+n^{2\sqrt{10}}}$;

3) $\dfrac{m^{\sqrt{3}}+n^{\sqrt{3}}}{m^{\frac{2\sqrt{3}}{3}}-m^{\frac{\sqrt{3}}{3}}n^{\frac{\sqrt{3}}{3}}+n^{\frac{2\sqrt{3}}{3}}}$; 4) $\dfrac{m^{\sqrt{5}}-n^{\sqrt{5}}}{m^{\frac{2\sqrt{5}}{3}}+m^{\frac{\sqrt{5}}{3}}n^{\frac{\sqrt{5}}{3}}+n^{\frac{2\sqrt{5}}{3}}}$;

5) $\dfrac{m^{\sqrt{2}}}{1-m^{3\sqrt{2}}}:\dfrac{m^{\sqrt{2}}+m^{2\sqrt{2}}}{m^{2\sqrt{2}}+m^{\sqrt{2}}+1}$; 6) $\dfrac{m^{3\sqrt{7}}+27}{m^{\sqrt{7}}}:\dfrac{m^{2\sqrt{7}}-3m^{\sqrt{7}}+9}{m^{\sqrt{7}}-m^{2\sqrt{7}}}$.

2.9. 1) $\left(\dfrac{a^{\sqrt{2}}+2}{a^{\sqrt{2}}-2}+\dfrac{a^{\sqrt{2}}-2}{a^{\sqrt{2}}+2}-\dfrac{16}{a^{2\sqrt{2}}-4}\right)^2$;

2) $\left(\dfrac{a^{\sqrt{7}}-4}{a^{\sqrt{7}}+4}+\dfrac{a^{\sqrt{7}}+4}{a^{\sqrt{7}}-4}-\dfrac{64}{a^{2\sqrt{7}}-16}\right)^2$;

3) $\left(\dfrac{2}{\left(1-a^{\sqrt{2}}\right)^2}+\dfrac{1}{a^{2\sqrt{2}}-1}\right)\left(a^{\sqrt{2}}-1\right)^2-\dfrac{3a^{\sqrt{2}}}{a^{\sqrt{2}}+1}$;

4) $\left(\dfrac{2}{\left(2a^{\sqrt{5}}+1\right)^2}-\dfrac{1}{1-4a^{2\sqrt{5}}}\right):\dfrac{1}{\left(1+2a^{\sqrt{5}}\right)^2}-\dfrac{6a^{\sqrt{5}}}{2a^{\sqrt{5}}-1}$;

5) $\left(\dfrac{a^{\sqrt{3}}+1}{a^{\sqrt{3}}-1}-\dfrac{a^{\sqrt{3}}-1}{a^{\sqrt{3}}+1}+4a^{\sqrt{3}}\right)\left(a^{\sqrt{3}}-\dfrac{1}{a^{\sqrt{3}}}\right)$;

6) $\left(\dfrac{a^{\sqrt{10}}}{a^{\sqrt{10}}-b^{\sqrt{10}}}-\dfrac{a^{\sqrt{10}}}{a^{\sqrt{10}}+b^{\sqrt{10}}}\right)\left(\dfrac{a^{\sqrt{10}}}{b^{\sqrt{10}}}+\dfrac{b^{\sqrt{10}}}{a^{\sqrt{10}}}-2\right)$.

2.2. Паказальная функцыя

Разгледзім выраз a^x, дзе a — лік, $a > 0$, $a \neq 1$, а x — зменная. Гэты выраз мае сэнс пры любым рэчаісным значэнні x, таму яго натуральным абсягам вызначэння з'яўляецца мноства ўсіх рэчаісных лікаў.

Азначэнне. ***Паказальнай функцыяй*** **называецца функцыя выгляду $y = a^x$, дзе a — лік, $a > 0$, $a \neq 1$.**

Абсяг вызначэння паказальнай функцыі — гэта натуральны абсяг вызначэння выразу a^x, г. зн. мноства ўсіх рэчаісных лікаў.

Відарысы графікаў некаторых паказальных функцый пры $a > 1$ паказаны на рысунку 23, пры $0 < a < 1$ — на рысунку 24. Як атрымліваюцца відарысы такіх графікаў?



y
$y = 2^x$
$y = 3^x$
3
2
$y = 1,2^x$
1
−1
O
1
2
x

Рыс. 23



$y = \left(\frac{1}{2}\right)^x$
y
$y = \left(\frac{1}{3}\right)^x$
3
2
$y = \left(\frac{5}{6}\right)^x$
1
−2
−1
O
1
x

Рыс. 24

Напрыклад, каб паказаць відарыс графіка функцыі $y = \left(\frac{3}{2}\right)^x$, нададзім некалькі значэнняў аргументу, вылічым адпаведныя значэнні функцыі і ўнясём іх у табліцу:

x	–4	–3	–2	–1	0	1	2	3	4
y	$\frac{16}{81}$	$\frac{8}{27}$	$\frac{4}{9}$	$\frac{2}{3}$	1	$\frac{3}{2}$	$\frac{9}{4}$	$\frac{27}{8}$	$\frac{81}{16}$

Вылічыўшы прыбліжаныя значэнні y з дакладнасцю да 0,1, атрымаем наступную табліцу:

x	–4	–3	–2	–1	0	1	2	3	4
y	0,2	0,3	0,4	0,7	1	1,5	2,3	3,4	5

Пакажам пункты $(x; y)$ з запісанымі каардынатамі на каардынатнай плоскасці Oxy (рыс. 25) і злучым гэтыя пункты плаўнай непарыўнай лініяй.



Рыс. 25

Атрыманую крывую можна разглядаць як відарыс графіка функцыі $y = \left(\frac{3}{2}\right)^x$ (рыс. 26).

Графік функцыі $y = \left(\frac{3}{2}\right)^x$ размешчаны над воссю Ox і перасякае вось Oy у пункце (0; 1). Заўважым яшчэ, што калі значэнні аргумента x памяншаюцца, то графік гэтай функцыі «прыціскаецца» да



Рыс. 26

восі Ox, а калі значэнні аргумента x павялічваюцца, то графік «крута падымаецца» ўверх.



Рыс. 27

Аналагічна для любой функцыі $y = a^x$ пры $a > 1$ (рыс. 27).

Пакажам цяпер відарыс графіка функцыі $y = \left(\frac{2}{3}\right)^x$. Для гэтага нададзім некалькі значэнняў аргументу, вылічым адпаведныя значэнні функцыі і ўнясём іх у табліцу:

x	-4	-3	-2	-1	0	1	2	3	4
y	$\frac{81}{16}$	$\frac{27}{8}$	$\frac{9}{4}$	$\frac{3}{2}$	1	$\frac{2}{3}$	$\frac{4}{9}$	$\frac{8}{27}$	$\frac{16}{81}$

Вылічыўшы прыбліжаныя значэнні y з дакладнасцю да 0,1, атрымаем наступную табліцу:

x	-4	-3	-2	-1	0	1	2	3	4
y	5	3,4	2,3	1,5	1	0,7	0,4	0,3	0,2

Пакажам пункты $(x; y)$ з запісанымі каардынатамі на каардынатнай плоскасці Oxy (рыс. 28) і злучым гэтыя пункты плаўнай непарыўнай лініяй.



Рыс. 28



Рыс. 29



Рыс. 30

Атрыманую крывую можна разглядаць як відарыс графіка функцыі $y = \left(\frac{2}{3}\right)^x$ (рыс. 29).

Графік функцыі $y = \left(\frac{2}{3}\right)^x$ размешчаны над воссю Ox і перасякае вось Oy у пункце (0; 1). Заўважым яшчэ, што калі значэнні аргумента x павялічваюцца, то графік гэтай функцыі «прыцісакаецца» да восі Ox, а калі значэнні аргумента x памяншаюцца, то графік «крута падымаецца» ўверх.

Аналагічна для любой функцыі $y = a^x$ пры $0 < a < 1$ (рыс. 30).

Тэарэма (*аб уласцівасцях паказальнай функцыі* $y = a^x$; $a > 0$, $a \neq 1$)

1. Абсягам вызначэння паказальнай функцыі з'яўляецца множства $\boldsymbol{R}$ усіх рэчаісных лікаў.

2. Мноствам (абсягам) значэнняў паказальнай функцыі з'яўляецца інтэрвал $(0; +\infty)$.

3. Паказальная функцыя найменшага і найбольшага значэнняў не мае.

4. Графік паказальнай функцыі перасякаецца з воссю ардынат у пункце $(0; 1)$ і не перасякаецца з воссю абсцыс.

5. Паказальная функцыя не мае нулёў.

6. Паказальная функцыя прымае дадатныя значэнні на ўсім абсягу вызначэння; усе пункты яе графіка ляжаць вышэй за вось Ox у I і II каардынатных вуглах.

7. Паказальная функцыя не з'яўляецца ні цотнай, ні няцотнай.

8. Пры $a > 1$ паказальная функцыя нарастае на ўсім абсягу вызначэння. Пры $0 < a < 1$ паказальная функцыя спадае на ўсім абсягу вызначэння.

9. Паказальная функцыя не з'яўляецца перыядычнай.

Уласцівасці, названыя ў гэтай тэарэме, мы прымем без доказу.

Відарыс графіка паказальнай функцыі дазваляе наглядна ўявіць гэтыя ўласцівасці.

Мноства (абсяг) значэнняў паказальнай функцыі — гэта праекцыя яе графіка на вось Oy, а на рысунках 27 і 30 бачна, што гэтая праекцыя ёсць інтэрвал $(0; +\infty)$ на восі Oy. Гэта значыць, што для любога пункта y_1, які належыць гэтаму інтэрвалу, знойдзецца такі пункт x_1 на восі Ox, што $y_1 = a^{x_1}$ (*уласцівасць* 2).

Мноства (абсяг) значэнняў паказальнай функцыі — гэта інтэрвал $(0; +\infty)$, а ў гэтым інтэрвале няма ні найменшага ліку, ні найбольшага (*уласцівасць* 3).

Графік паказальнай функцыі праходзіць праз пункт $(0; 1)$ і ляжыць у верхняй паўплоскасці (*уласцівасці* 4, 5, 6).

Графік паказальнай функцыі не сіметрычны адносна восі ардынат, таму яна не з'яўляецца цотнай; графік паказальнай функцыі не



Рыс. 31

сіметрычны адносна пачатку каардынат, таму яна не з'яўляецца няцотнай (*уласцівасць* 7).

На рысунку 27 бачна, што пры $a > 0$ паказальная функцыя на абсягу вызначэння нарастае, на рысунку 30 бачна, што пры $0 < a < 1$ паказальная функцыя на абсягу вызначэння спадае (*уласцівасць* 8).

На графіку паказальнай функцыі няма пунктаў з аднолькавымі ардынатамі, таму яна не з'яўляецца перыядычнай (*уласцівасць* 9).

▲ Да графіка паказальнай функцыі $y = a^x$ можна правесці невертыкальную датычную ў любым яго пункце, у тым ліку і ў пункце (0; 1) (напомнім, што гэта азначае наяўнасць вытворнай функцыі ў гэтым пункце).

Калі $a > 1$, то вугал α, які ўтварае такая датычная з воссю Ox, востры. Напрыклад, калі $a = 2$, то $\alpha \approx 38° < 45°$ (рыс. 31, *а*), а калі $a = 3$, то $\alpha \approx 47° > 45°$ (рыс. 31, *б*).

Існуе аснова $2 < a < 3$ такой адзінай паказальнай функцыі, што датычная, праведзеная да яе графіка ў пункце (0; 1), утварае з воссю Ox вугал $\alpha = 45°$ (рыс. 31, *в*).

Асновай паказальнай функцыі з такой уласцівасцю з'яўляецца лік, які быў адкрыты яшчэ ў XVII ст. Джонам Неперам (яго партрэт — на вокладцы) і названы ***неперавым лікам***; ён прыбліжана роўны 2,7182818284. З XVIII ст. неперавы лік сталі абазначаць літарай ***e***, у гонар знакамітага Леанарда Эйлера. У 1766 г. Ламбертам (з дапамогай прыёму Эйлера) было даказана, што лік e, як і

лік π, ірацыянальны. Лікі e і π вельмі важныя для матэматыкі, яны ўваходзяць у вялікую колькасць формул.
У расійскіх гімназіях для запамінання прыбліжанага значэння ліку e выкарыстоўвалі такі вершык:
«*Помнить е — закон простой:*
Два, семь, дважды Лев Толстой»,
паколькі 1828 — год нараджэння вялікага рускага пісьменніка Л. М. Талстога. ▲

Прыклад. Запісаць найбольшае і найменшае значэнні функцыі (калі яны існуюць):

а) $y = 3^{x^2}$; б) $y = \frac{1}{3} \cdot 0{,}7^{\sin x}$.

Рашэнне. а) Паколькі 3 — дадатны лік, большы за 1, то большаму значэнню паказчыка x^2 адпавядае і большае значэнне ступені 3^{x^2}. Але выраз x^2 пры $x = 0$ мае найменшае значэнне, а найбольшага значэння не мае. Значыць, пры любых значэннях x правільная няроўнасць

$$3^{x^2} \geqslant 3^0, \text{ г. зн. } 3^{x^2} \geqslant 1.$$

б) Паколькі 0,7 — дадатны лік, меншы за 1, то большаму значэнню паказчыка $\sin x$ адпавядае меншае значэнне ступені $0{,}7^{\sin x}$. Значэнні выразу $\sin x$ пры любых значэннях x задавальняюць няроўнасць

$$-1 \leqslant \sin x \leqslant 1.$$

Такім чынам, пры любых значэннях x правільная няроўнасць

$$0{,}7^1 \leqslant 0{,}7^{\sin x} \leqslant 0{,}7^{-1}.$$

Значыць, правільная і няроўнасць

$$\frac{1}{3} \cdot 0{,}7 \leqslant \frac{1}{3} \cdot 0{,}7^{\sin x} \leqslant \frac{1}{3} \cdot 0{,}7^{-1}, \text{ г. зн.}$$

$$\frac{7}{30} \leqslant \frac{1}{3} \cdot 0{,}7^{\sin x} \leqslant \frac{10}{21}.$$

Адказ: а) 1 — найменшае значэнне функцыі $y = 3^{x^2}$; найбольшага значэння няма;

б) $\frac{7}{30}$ — найменшае значэнне, а $\frac{10}{21}$ — найбольшае значэнне функцыі $y = \frac{1}{3} \cdot 0{,}7^{\sin x}$.

?

1. Сфармулюйце азначэнне паказальнай функцыі.
2. Сфармулюйце тэарэму аб уласцівасцях паказальнай функцыі $y = a^x$ $(a > 0,\ a \neq 1)$.
3. Як можна пераканацца, што паказальная функцыя з асновай $0 < a < 1$:
   а) не прымае найбольшага значэння;
   б) не прымае найменшага значэння;
   в) не з'яўляецца цотнай;
   г) не з'яўляецца няцотнай;
   д) не з'яўляецца перыядычнай?
4. Няхай f — паказальная функцыя. Дакажыце, не карыстаючыся відарысам яе графіка, што:
   а) функцыя f не з'яўляецца цотнай;
   б) функцыя f не з'яўляецца няцотнай.

5*. Што вы ведаеце пра лік e?

Практыкаванні

2.10°. Ці з'яўляецца паказальнай функцыя:

1) $y = 3^x$; 2) $y = x^2$; 3) $y = (-3)^x$;
4) $y = \sqrt{3^x}$; 5) $y = x$; 6) $y = (x-2)^5$;
7) $y = \pi^x$; 8) $y = 5^{-x}$; 9) $y = \left(\frac{1}{\pi}\right)^{2x}$?

2.11°. Выкарыстаўшы відарыс графіка функцыі $y = \left(\frac{3}{2}\right)^x$ (гл. рыс. 26), вызначыце прыбліжана з дакладнасцю да 0,1 значэнні функцыі пры x, роўным:

1) 1,5; 2) −1,5; 3) −2,5; 4) 2,5;
5) −0,5; 6) −1,3; 7) 2,8; 8) 3,5.

Пакажыце схематычна відарыс графіка функцыі (**2.12—2.13**).

2.12°. 1) $y = 4^x$; 2) $y = \left(\frac{1}{4}\right)^x$; 3) $y = 3{,}5^x$;
4) $y = 2{,}5^x$; 5) $y = \left(\frac{3}{4}\right)^x$; 6) $y = \left(\frac{2}{3}\right)^x$.

2.13°. 1) $y = \left(\sqrt{0{,}4}\right)^x$; 2) $y = \left(\frac{1}{\sqrt{2}}\right)^x$; 3) $y = \sqrt{3^x}$;
4) $y = \sqrt{\left(\frac{6}{19}\right)^x}$; 5) $y = \pi^x$; 6) $y = \left(\frac{\pi}{3}\right)^x$;
7) $y = \left(\frac{\pi}{6}\right)^x$; 8) $y = 0{,}2017^x$; 9) $y = 2016{,}2015^x$.

2.14. Пры якім значэнні a графік функцыі $y = a^x$ праходзіць праз пункт:

1) $A(1;\ 2)$; 2) $B(2;\ 9)$; 3) $C(2;\ 16)$;
4) $D(-2;\ 4)$; 5) $K\left(-3;\ \frac{1}{27}\right)$; 6) $M\left(\frac{1}{2};\ \sqrt{2}\right)$?

2.15. 1) Знайдзіце значэнне m, калі пункт $A(\sin 30°;\ m)$ належыць графіку функцыі $y = 25^x$.
2) Знайдзіце значэнне k, калі пункт $D(\cos 60°;\ k)$ належыць графіку функцыі $y = 16^x$.

2.16. 1) Знайдзіце значэнне p, калі пункт $B\left(p;\ 16\cos\frac{\pi}{3}\right)$ належыць графіку функцыі $y = 2^x$.
2) Знайдзіце значэнне t, калі пункт $M\left(t;\ 32\sin\frac{\pi}{2}\right)$ належыць графіку функцыі $y = 2^x$.

2.17. Запішыце каардынаты пункта перасячэння графікаў функцый:

1) $y = 2^x$ і $y = 8$; 2) $y = 3^x$ і $y = \frac{1}{3}$;
3) $y = \left(\frac{1}{3}\right)^x$ і $y = 9$; 4) $y = \left(\frac{1}{4}\right)^x$ і $y = \frac{1}{64}$.

2.18. Ці мае графік функцыі $y = 2^x$ агульныя пункты з прамой:

1) $y = 12$; 2) $y = -3$; 3) $y = 0$; 4) $y = 0{,}0001$?

2.19. Ці мае графік функцыі $y = 2^x - 1$ агульныя пункты з прамой:

1) $y = 6$; 2) $y = -1$; 3) $y = 0$; 4) $y = -1{,}004$?

2.20. Ці мае графік функцыі $y = 2^x + 2$ агульныя пункты з прамой:

1) $y = 7$; 2) $y = 1$; 3) $y = 2$; 4) $y = 2{,}05$?

2.21°. Параўнайце:

1) $1{,}8^0$ і 1; 2) 1 і $0{,}4^2$;
3) $4{,}3^{1,5}$ і $4{,}3^{1,6}$; 4) $0{,}3^{-3}$ і $0{,}3^{-2}$;
5) $\left(\frac{1}{7}\right)^{\sqrt{2}}$ і $\left(\frac{1}{7}\right)^{1,6}$; 6) 3^{π} і $3^{3,14}$;
7) $\left(\frac{\pi}{4}\right)^{\sqrt{3}}$ і $\left(\frac{\pi}{4}\right)^{\frac{2\pi}{3}}$; 8) $\left(\frac{\pi}{2}\right)^{\sqrt{7}}$ і $\left(\frac{\pi}{2}\right)^{\frac{4\pi}{5}}$;
9) $\sqrt{3}^{\sin\sqrt{3}}$ і $\left(\frac{2\pi}{5}\right)^{\sin\sqrt{3}}$; 10) $\sqrt{0{,}5}^{\cos\sqrt{6}}$ і $\left(\frac{\pi}{6}\right)^{\cos\sqrt{6}}$.

2.22. Ці з'яўляецца нарастальнай (спадальнай) функцыя:

1) $y = 4^x$; 2) $y = 0{,}5^x$; 3) $y = \left(\sin\frac{\pi}{3}\right)^x$;

4) $y = \left(\cos\frac{\pi}{4}\right)^x$; 5) $y = \left(\operatorname{tg}\frac{\pi}{3}\right)^x$; 6) $y = \left(\operatorname{ctg}\frac{\pi}{3}\right)^x$;

7) $y = 0{,}2^{-x}$; 8) $y = 1{,}4^{-x}$; 9) $y = \left(\frac{1}{15}\right)^{-2x}$;

10) $y = \left(1\frac{3}{7}\right)^{-3x}$; 11) $y = 67^{-\frac{x}{2}}$; 12) $y = 0{,}64^{-\frac{x}{4}}$?

2.23. На рысунку 32 паказаны відарыс графіка функцыі, зададзенай формулай $y = a^x$ на мностве D. Запішыце для яе:

а) значэнне a;
б) абсяг вызначэння;
в) мноства (абсяг) значэнняў;
г) прамежкі нарастання (спадання);
д) каардынаты пункта перасячэння графіка з воссю Oy;
е) значэнні ў пунктах $x_1 = -1$ і $x_2 = 1$;
ж) найбольшае і найменшае значэнні.



Рыс. 32

Запішыце (пры $a > 0$) натуральны абсяг вызначэння выразу (**2.24—2.25**).

2.24. 1) a^{3x}; 2) $a^{\sqrt{x}}$; 3) $a^{\frac{1}{\sqrt{x}}}$;

4) $a^{\frac{6}{4-x^2}}$; 5) $a^{\frac{2}{x^2+16}}$; 6) $a^{\frac{4}{x^2-9}}$;

7) $a^{\sqrt{16-x^2}}$; 8) $a^{\sqrt{x^2-64}}$; 9) $a^{\sqrt{5x-6-x^2}}$.

2.25. 1) $a^{\sin x}$; 2) $a^{\cos x+1}$; 3) $a^{\frac{1}{\sin 2x}}$;

4) $a^{\frac{1}{\cos 0{,}5x}}$; 5) $a^{\operatorname{tg} x}$; 6) $a^{\operatorname{ctg} x}$;

7) $a^{\frac{1}{\sin x-1}}$; 8) $a^{\frac{1}{\cos x+1}}$; 9) $a^{\sqrt{\operatorname{tg} x}}$.

Запішыце найменшае і найбольшае значэнні выразу (калі яны існуюць) (**2.26—2.28**).

2.26. 1) 2^x; 2) $\left(\frac{1}{\pi}\right)^x$; 3) $4^{\sqrt{x}}$; 4) $\frac{1}{5^{|x|}}$.

2.27*. 1) $5 \cdot 2^{\sin x}$; 2) $6 \cdot 2^{\cos x}$;

3) $0{,}3^{\sin^2 x} \cdot 0{,}3^{\cos^2 x}$; 4) $4{,}5^{\sin^2 x} \cdot 4{,}5^{\cos^2 x}$;

5) $11^{\frac{1}{\sin^2 x}} : 11^{\operatorname{ctg}^2 x}$; 6) $7{,}4^{\frac{1}{\cos^2 x}} : 7{,}4^{\operatorname{tg}^2 x}$;

7) $6^{\sin^2 x} \cdot 6$; 8) $4 \cdot 4^{\cos^2 x}$.

2.28*. 1) 4^{x^2-x-6}; 2) 6^{x^2-x-2};

3) 2^{5x-6-x^2}; 4) 5^{10-x^2-3x}.

Рашыце няроўнасць (**2.29—2.30**).

2.29. 1) $6^x > 0$; 2) $6^x < 0$;
3) $6^x > -2$; 4) $6^x < -6$.

2.30. 1) $3^x > 1$; 2) $3^x < 1$;

3) $\left(\frac{1}{4}\right)^x < 1$; 4) $\left(\frac{1}{4}\right)^x > 1$;

5) $\left(\operatorname{tg}\frac{4\pi}{3}\right)^x \geqslant 1$; 6) $\left(\operatorname{ctg}\frac{10\pi}{3}\right)^x \leqslant 1$.

Пакажыце схематычна відарыс графіка функцыі (**2.31—2.32**).

2.31. 1) $y = 3^x - 2$; 2) $y = \left(\frac{1}{2}\right)^x + 3$;

3) $y = 2^{x+1}$; 4) $y = 3^{x-2}$;

5) $y = \left(\frac{1}{3}\right)^{3-x}$; 6) $y = \left(\frac{1}{2}\right)^{4-x}$;

7) $y = 2^{x-3} + 1$; 8) $y = 3^{x+1} - 2$.

2.32. 1) $y = -3^x$; 2) $y = -0{,}5^x$;
3) $y = -0{,}1^{-2x} + 1$; 4) $y = -2^{-2x} - 2$;
5) $y = 2 - 3^x$; 6) $y = 3 - 2^x$.

2.33*. Няхай $0 < a < 1$. Пакажыце схематычна відарыс графіка функцыі і запішыце яе ўласцівасці:

1) $y = a^x$; 2) $y = a^{x-1}$; 3) $y = a^{x+1}$;
4) $y = a^x + 1$; 5) $y = a^x - 1$; 6) $y = a^{x+1} - 1$;
7) $y = a^{x-1} + 1$; 8) $y = a^{x-1} - 1$; 9) $y = a^{x+1} + 1$;
10) $y = -a^x$; 11) $y = -a^x + 2$; 12) $y = -a^{x+2}$.

2.34*. Пакажыце схематычна відарыс графіка функцыі з практыкавання 2.33 пры $a > 1$ і запішыце яе ўласцівасці.

Пакажыце схематычна відарыс графіка функцыі (**2.35—2.38**).

2.35*. 1) $y = \left|2^x\right|$; 2) $y = 4^{|x|}$; 3) $y = \left|3^{-x}\right|$;

4) $y = 5^{-|x|}$; 5) $y = -\left|0{,}5^{-x}\right|$; 6) $y = -0{,}2^{|x|}$;

7) $y = \left|3^{|x|}\right|$; 8) $y = -\left|4^{|x|}\right|$.

2.36*. 1) $y = \left|3^x - 1\right|$; 2) $y = \left|0{,}5^x - 2\right|$;

3) $y = \left|0{,}2^{x+1} - 2\right|$; 4) $y = \left|2^{x-1} - 1\right|$.

2.37*. 1) $y = 3^{|x|+x}$; 2) $y = 3^{|x|-x}$;

3) $y = 3^{|x-2|+|x+1|}$; 4) $y = 3^{|x-1|+|x+2|}$;
5) $y = 3^{|x+1|-|x-2|}$; 6) $y = 3^{|x+3|-|x-4|}$.

2.38*. 1) $y = \frac{4^x - 4}{2^x - 2}$; 2) $y = \frac{9^x - 9}{3^x + 3}$;

3) $y = \frac{4^{2x} + 4^x}{4^x + 4^0}$; 4) $y = \frac{3^{2x} - 3^x}{3^x - 3^0}$.

2.3. Паказальныя ўраўненні

Разгледзім ураўненні, у якіх зменная (невядомае) знаходзіцца ў паказчыку ступені. Напрыклад:

$$3^x = 81;$$
$$8 \cdot 2^{x-1} \cdot 2^x + 5 \cdot 2^{x+2} = 92;$$
$$9^x + 5 \cdot 6^x + 64^x = 0.$$

Ураўненні такога выгляду прынята называць ***паказальнымі***.

Пры рашэнні паказальных ураўненняў нам будзе карысны вынік з тэарэмы аб уласцівасцях паказальнай функцыі.

Вынік. Няхай $a > 0$, $a \neq 1$. Калі ступені з асновай a роўныя, то іх паказчыкі роўныя, г. зн. калі $a^s = a^t$, то $s = t$.

Відарысы графікаў паказальнай функцыі падказваюць гэтую ўласцівасць. На рысунках 27, 30 бачна, што кожнаму значэнню паказальнай функцыі $y = a^s$ адпавядае адзіны паказчык s.

Доказ гэтага выніку абапіраецца на тэарэму з п. 2.2.

Прыклад 1. Рашыць ураўненне $3^{2x^2-3x+5} = 3^{x^2+2x-1}$.

Рашэнне. Згодна з вынікам з роўнасці дзвюх ступеней з аднолькавай асновай 3 вынікае роўнасць іх паказчыкаў. Такім чынам, дадзенае ўраўненне раўназначна ўраўненню

$$2x^2 - 3x + 5 = x^2 + 2x - 1,$$

адкуль

$$x_1 = 2;\ x_2 = 3.$$

Адказ: 2; 3.

Прыклад 2. Рашыць ураўненне:

а) $27\left(\sqrt{3}\right)^{2x-4} = 81^{\frac{3}{2x}}$; б) $\sqrt[4]{32^x} = 0{,}25^{x^2+5x}$.

Рашэнне. а) Дадзенае ўраўненне раўназначна (патлумачце чаму) ураўненню

$$3^{x+1} = 3^{\frac{6}{x}}.$$

Калі ступені з асновай 3 роўныя, то роўныя і іх паказчыкі:

$$x + 1 = \frac{6}{x}.$$

Рашыўшы гэтае ўраўненне, атрымаем

$$x_1 = -3,\ x_2 = 2.$$

б) $\sqrt[4]{32^x} = 0{,}25^{x^2+5x} \Leftrightarrow 2^{\frac{5x}{4}} = 2^{-2\left(x^2+5x\right)} \Leftrightarrow \frac{5x}{4} = -2x^2 - 10x \Leftrightarrow$

$\Leftrightarrow 8x^2 + 45x = 0 \Leftrightarrow x(8x+45) = 0 \Leftrightarrow \left(x = 0 \text{ або } x = -\frac{45}{8}\right).$

Адказ: а) –3; 2; б) 0; $-\frac{45}{8}$.

! Пры рашэнні кожнага ўраўнення з прыкладу 2 спачатку абедзве часткі ўраўнення запісалі ў выглядзе ступені з адной і той жа асновай, а затым запісалі роўнасць паказчыкаў гэтых ступеней.

Прыклад 3. Рашыць ураўненне:

а) $8 \cdot 2^{3x-1} - 2^{3x} + 5 \cdot 2^{3x+2} = 92;$ б) $3^x = 5^x$.

Рашэнне. а) Дадзенае ўраўненне раўназначна ўраўненню

$$2^{3x-1}\left(8 - 2^{3x-(3x-1)} + 5 \cdot 2^{3x+2-(3x-1)}\right) = 92.$$

Рашыўшы яго, атрымаем:

$$2^{3x-1}(8 - 2 + 5 \cdot 2^3) = 92;$$

$$2^{3x-1} \cdot 46 = 92;$$

$$2^{3x-1} = 2.$$

Паколькі дзве ступені з аднолькавай асновай 2 роўныя, то роўныя і іх паказчыкі, г. зн. $3x - 1 = 1$, адкуль знаходзім $x = \frac{2}{3}$.

б) Раздзяліўшы абедзве часткі ўраўнення на $5^x > 0$, атрымаем ураўненне $\left(\frac{3}{5}\right)^x = 1$, раўназначнае дадзенаму. Рашыўшы яго, атрымаем $\left(\frac{3}{5}\right)^x = \left(\frac{3}{5}\right)^0$, г. зн. $x = 0$.

Адказ: а) $\frac{2}{3}$; б) 0.

! Пры рашэнні прыкладу 3 а) левую частку ўраўнення расклалі на множнікі. Прычым за дужку вынеслі такі множнік, што ў дужках застаўся лікавы выраз, які не змяшчае зменнай.

Прыклад 4. Рашыць ураўненне $9^x - 12 \cdot 3^x + 27 = 0$.

Рашэнне. Абазначым $3^x = t$, тады $9^x = t^2$.

Такім чынам, з дадзенага ўраўнення атрымліваем

$$t^2 - 12t + 27 = 0,$$

адкуль знаходзім $t = 3$ або $t = 9$.

З улікам абазначэнняў маем:

$$3^x = 3 \text{ або } 3^x = 9;$$
$$x = 1 \text{ або } x = 2.$$

Адказ: 1; 2.

! При рашэнні прыкладу 4 быў выкарыстаны метад увядзення новай зменнай, які дазволіў звесці дадзенае ўраўненне да квадратнага адносна гэтай зменнай.

Прыклад 5. Рашыць ураўненне $3^{\frac{x}{2}} + 2^x = 16 - 3^x$.

Рашэнне. Можна заўважыць, што 2 — корань дадзенага ўраўнення. Іншых каранёў ураўненне не мае, паколькі функцыя, што стаіць у левай частцы ўраўнення, нарастальная, а функцыя, што стаіць у правай частцы ўраўнення, спадальная. Таму ўраўненне мае не больш за адзін корань (гл. тэарэму з п. 1.14).

Адказ: 2.

Прыклад 6. Рашыць ураўненне $6^x - 81 \cdot 2^x - 8 \cdot 3^x + 648 = 0$.

Рашэнне. $3^x \cdot 2^x - 81 \cdot 2^x - 8 \cdot 3^x + 648 = 0 \Leftrightarrow$

$$\Leftrightarrow 2^x(3^x - 81) - 8(3^x - 81) = 0 \Leftrightarrow$$
$$\Leftrightarrow (3^x - 81)(2^x - 8) = 0 \Leftrightarrow$$
$$\Leftrightarrow (3^x - 81 = 0 \text{ або } 2^x - 8 = 0) \Leftrightarrow$$
$$\Leftrightarrow (3^x = 3^4 \text{ або } 2^x = 2^3) \Leftrightarrow$$
$$\Leftrightarrow (x = 4 \text{ або } x = 3).$$

Адказ: 3; 4.

Прыклад 7. Пры якім значэнні a коранем ураўнення

$$3^{1 + x - x^2} = 3^{a - 8}$$

з'яўляецца лік, роўны 2?

Рашэнне. Паколькі $x = 2$ — корань, то будзе правільнай роўнасць

$$3^{1 + 2 - 2^2} = 3^{a - 8}, \text{ г. зн. } 3^{-1} = 3^{a - 8}.$$

Рашыўшы гэтае ўраўненне, знойдзем $a = 7$.

Адказ: пры $a = 7$.

?

1. Сфармулюйце вынік з роўнасці ступеней з дадатнымі адрознымі ад 1 асновамі.
2. Прывядзіце прыклады паказальных ураўненняў.
3. Апішыце спосаб рашэння ўраўнення выгляду $a^{f(x)} = a^{g(x)}$ пры $a > 0$, $a \neq 1$.
4. Апішыце спосаб рашэння ўраўнення выгляду

$$216 \cdot 6^{f(x)} = \left(\sqrt[5]{36}\right)^{g(x)}.$$

5. Апішыце спосаб рашэння ўраўнення выгляду
$$13 \cdot 6^{f(x)} = 7 \cdot 6^{f(x)+1} - 6^{f(x)+2} + 42.$$
6. Апішыце спосаб рашэння ўраўнення выгляду
$$5 \cdot 49^{f(x)} - 34 \cdot 7^{f(x)} - 7 = 0.$$

Практыкаванні

Рашыце ўраўненне (**2.39—2.57**).

2.39°. 1) $5^x = 125$; 2) $6^x = 1296$;
3) $\left(\frac{1}{3}\right)^x = \frac{1}{81}$; 4) $\left(\frac{1}{4}\right)^x = \frac{1}{256}$;
5) $\left(\frac{1}{2}\right)^x = 8$; 6) $\left(\frac{1}{5}\right)^x = 625$;
7) $16^x = \frac{1}{4}$; 8) $27^x = \frac{1}{3}$;
9) $\left(\frac{1}{2}\right)^x = -2$; 10) $\left(\frac{2}{5}\right)^x = -2{,}5$.

2.40°. 1) $3^{5-2x} = 1$; 2) $4^{8+5x} = 1$;
3) $3^{x^2-x} = 1$; 4) $4^{x^2+x} = 1$;
5) $\left(\frac{1}{\sqrt{2}}\right)^{x^2-9} = 1$; 6) $1 = \left(\frac{1}{\sqrt{3}}\right)^{x^2-25}$;
7) $\left(5^{x^2+x-2}\right)^{3-x} = 1$; 8) $1 = \left(6^{x^2-10x+16}\right)^{4-x^2}$.

2.41°. 1) $2^{x+1} = 16$; 2) $3^{2-x} = 27$;
3) $4^{x-1} = 32$; 4) $8^{x+2} = 128$;
5) $9^{-x} = 27$; 6) $8^{-x} = 16$;
7) $9^{\frac{1}{2}x-1} - 3 = 0$; 8) $27^{3-\frac{1}{3}x} - 81 = 0$;
9) $5^{x-3} + 5^2 = 25$; 10) $7^{2-x} + 49 = 7^2$.

2.42°. 1) $\left(\frac{1}{9}\right)^{2x-5} = 3^{5x-8}$; 2) $\left(\frac{1}{2}\right)^{x-4} = 2^{4x-9}$;
3) $\left(\frac{5}{6}\right)^{1-2x} = \left(\frac{6}{5}\right)^{2+x}$; 4) $\left(\frac{7}{13}\right)^{3-2x} = \left(\frac{13}{7}\right)^{4+3x}$;
5) $\left(\frac{2}{3}\right)^{5x^2-29} = \left(\frac{3}{2}\right)^{x^2+5}$; 6) $\left(\frac{11}{2}\right)^{8x^2+5x} = \left(\frac{2}{11}\right)^{-2x^2-8x}$.

2.43. 1) $0{,}04^{2-x} = 25^{-1}$; 2) $0{,}5^{3x-1} = 16^{-2}$;
3) $3{,}5^{x-5} = \left(\frac{4}{49}\right)^2$; 4) $0{,}8^{3-2x} = 1{,}25^3$;
5) $0{,}125^{x-1} = 2^3$; 6) $0{,}625^{4x+1} = 1{,}6^{3-2x}$.

2.44. 1) $3 \cdot 9^x = 81$; 2) $2 \cdot 4^x = 64$;
3) $3^{x+0,5} \cdot 3^{x-2} = 3$; 4) $0,5^{x+7} \cdot 0,5^{1-2x} = 2$;
5) $8^x \cdot 4^{x+13} = \frac{1}{16}$; 6) $2^{x-2} \cdot 4^{1+x} = \frac{1}{8}$.

2.45. 1) $\left(\frac{1}{\sqrt{3}}\right)^{2x+1} = \left(3\sqrt{3}\right)^x$; 2) $\left(\frac{2}{\sqrt[3]{2}}\right)^{2x} = \left(\sqrt[3]{2}\right)^{x-1}$;
3) $9^{3x+4} \cdot \sqrt{3} = \frac{27^{x-1}}{\sqrt{3}}$; 4) $\frac{8}{\left(\sqrt{2}\right)^x} = 4^{3x-2} \cdot \sqrt{2}$;
5) $\frac{25^{x-2}}{\sqrt{5}} = \left(\frac{1}{5}\right)^{x-75}$; 6) $25^{3-2x} = \frac{1}{125}\left(25\sqrt{5}\right)^{-x}$;
7) $0,125 \cdot 4^{2x-3} = \left(\frac{0,25}{\sqrt{2}}\right)^{-x}$; 8) $0,008\left(25\sqrt{5}\right)^{-x} = 25^{3-2x}$.

2.46. 1) $\sqrt{5^{x+2}} = \frac{1}{\sqrt[5]{5}}$; 2) $\sqrt[3]{3^{x-1}} = \frac{3}{\sqrt{3}}$;
3) $\sqrt[3]{49^{2x+1}} = \frac{7}{\sqrt[5]{7}}$; 4) $\sqrt[5]{6^{x+1}} = \frac{36}{\sqrt{6}}$;
5) $16^{-1}\sqrt{64^x} = 2^x$; 6) $8^{-1}\sqrt{16^x} = 2^{\frac{x}{2}}$;
7) $\sqrt{\sqrt[3]{2^x}} = 4$; 8) $\sqrt[5]{\sqrt[3]{3^x}} = 27$.

2.47. 1) $0,5^{x^2} \cdot 2^{2x+2} = \frac{1}{64}$; 2) $2^{x^2-6x+0,5} = \frac{1}{16\sqrt{2}}$;
3) $16 \cdot \sqrt[5]{8^{x^2-3x-5}} = 128$; 4) $\frac{1}{27} \cdot \sqrt[4]{9^{3x-1}} = 27^{-\frac{2}{3}}$.

2.48. 1) $\left(\frac{5}{6}\right)^{13\sqrt{x}+5} = \left(\frac{6}{5}\right)^{7\sqrt{x}-45}$; 2) $\left(\frac{51}{9}\right)^{\sqrt{x-1}-3} = \left(\frac{9}{51}\right)^{8\sqrt{x-1}-15}$;
3) $\left(\frac{14}{19}\right)^{\frac{5}{\sqrt{x}}-3} = \left(\frac{19}{14}\right)^{-\frac{7}{\sqrt{x}}+5}$; 4) $\left(\frac{33}{15}\right)^{\frac{11}{\sqrt{x+1}}+5} = \left(\frac{15}{33}\right)^{\frac{7}{\sqrt{x+1}}-8}$.

2.49°. 1) $2^x \cdot 3^x = 36$; 2) $2^x \cdot 5^x = 0,1$;
3) $\left(\frac{2}{3}\right)^x\left(\frac{9}{8}\right)^x = \frac{27}{64}$; 4) $\left(\frac{2}{5}\right)^x\left(\frac{125}{8}\right)^x = \frac{625}{16}$;
5) $5^x \cdot 2^{2x} = 400$; 6) $2^x \cdot 3^{2x} = 324$.

2.50. 1) $\frac{6^{x^2}}{3^2} = \frac{2^2}{6^{8-5x}}$; 2) $\frac{10^{x^2}}{2^4} = \frac{5^4}{10^{9-6x}}$;
3) $\frac{2^{x^2+2}}{6^{3x}} = \frac{6^{3x-6}}{3^{x^2+2}}$; 4) $\frac{2^{2x^2-6x}}{12^{3-x}} = \frac{12^{1-2x}}{3^{x^2-3x}}$.

2.51. 1) $3^{x+1} + 3^x = 108$; 2) $2^{x+2} + 2^x = 5$;
3) $2^x - 2^{x-2} = 12$; 4) $3^{x+2} + 3^{x+1} + 3^x = 39$;
5) $2 \cdot 3^{x+1} + 3^{x+3} = 33$; 6) $5^{x+2} + 11 \cdot 5^x = 180$;

7) $3^{x+1} - 2 \cdot 3^{x-1} - 4 \cdot 3^{x-2} = 17;$
8) $2^{x+1} + 3 \cdot 2^{x-1} - 5 \cdot 2^{x} + 6 = 0.$

2.52. 1) $6^{x-2} - \left(\frac{1}{6}\right)^{3-x} + 36^{\frac{x-1}{2}} = 246;$

2) $49^{\frac{2x-2}{2}} + \left(\frac{1}{7}\right)^{3-2x} + 7^{2x-1} = 399;$

3) $3^{x-1} - \left(\frac{1}{3}\right)^{3-x} = \sqrt{\frac{1}{9^{4-x}}} + 207;$

4) $2^{2x-1} + \left(\frac{1}{2}\right)^{2-2x} + 4^{x+1} = -\sqrt{\frac{1}{4^{3-2x}}} + 78;$

5) $25^{x-1} + \sqrt{\frac{1}{25^{-2x}}} = 525 + \left(\frac{1}{5}\right)^{1-2x};$

6) $2^{-(x-1)} + \sqrt{\frac{1}{4^{2+x}}} = 56 + \left(\frac{1}{2}\right)^{1+x}.$

2.53. 1) $2^{2x} + 2^{x} - 2 = 0;$ 2) $3^{2x} - 2 \cdot 3^{x} - 3 = 0;$
3) $9^{x} - 6 \cdot 3^{x} - 27 = 0;$ 4) $4^{x} - 14 \cdot 2^{x} - 32 = 0;$
5) $100^{x} - 11 \cdot 10^{x} + 10 = 0;$ 6) $49^{x} - 8 \cdot 7^{x} + 7 = 0;$
7) $36^{x} - 4 \cdot 6^{x} - 12 = 0;$ 8) $64^{x} - 8^{x} - 56 = 0.$

2.54. 1) $13^{2x+1} - 13^{x} = 12;$ 2) $3^{2x+1} - 10 \cdot 3^{x} + 3 = 0;$
3) $9^{x} + 3^{x+1} - 108 = 0;$ 4) $4^{x} + 2^{x+1} - 80 = 0.$

2.55. 1) $3^{-2x+1} + 5 \cdot \left(\frac{1}{3}\right)^{x} = 2;$ 2) $5 \cdot 5^{-2x} + 4 \cdot \left(\frac{1}{5}\right)^{x} = 1;$
3) $2^{-2x+3} = 2^{-x+1} + 1;$ 4) $2 \cdot 3^{-2x+2} = 3^{-x+1} + 1;$
5) $3 \cdot 2^{-2x+3} = 2^{-x+1} + 1;$ 6) $6 \cdot 5^{-2x+3} - 1 = 5^{-x+1}.$

2.56. 1) $5^{x} - 24 = \frac{25}{5^{x}};$ 2) $2^{x} + \frac{8}{2^{x}} = 16{,}5;$
3) $2^{x+2} - 2^{2-x} = 15;$ 4) $3^{x} + 3^{3-x} = 12;$
5) $9 - 2^{x} = 2^{3-x};$ 6) $4^{x} - 0{,}25^{x-2} = 15;$
7) $\left(\frac{1}{3}\right)^{x} + 3^{x+3} = 12;$ 8) $5 \cdot 5^{x^2} - 5^{1-x^2} = 24.$

2.57*. 1) $\sqrt{2 \cdot 5^{x} + 6} = 5^{x} - 1;$ 2) $\sqrt{10 - 3^{x+2}} = 3^{x+1} - 2;$
3) $\sqrt{3^{x} - 5} = 11 - 3^{x};$ 4) $\sqrt{9 \cdot 2^{x} + 25} = 2^{x} - 3.$

2.58*. 1) Пры якім значэнні a коранем ураўнення $2^{4+x-x^2} = 2^{a}$ з’яўляецца лік, роўны -1?

2) Пры якім значэнні a коранем ураўнення $5^{6+2x-x^2} = 5^a$ з'яўляецца лік, роўны 2?

2.59*. 1) Пры якім значэнні a коранем ураўнення $\left(\sqrt{3}\right)^{x^2+ax+2} = 3$ з'яўляецца лік, роўны −2?

2) Пры якім значэнні a коранем ураўнення $\left(\sqrt{7}\right)^{x^2-ax+4} = \frac{1}{7}$ з'яўляецца лік, роўны 1?

2.60*. 1) Пры якім значэнні a коранем ураўнення

$$0{,}5^{a+x} = \left(\sin\frac{\pi}{6}\right)^{x^2-2x}$$

з'яўляецца лік, роўны −1?

2) Пры якім значэнні a коранем ураўнення

$$\left(\sqrt{2}\right)^{a-x} = \left(\cos\frac{\pi}{4}\right)^{x^2+2x}$$

з'яўляецца лік, роўны 1?

Рашыце ўраўненне (**2.61—2.63**).

2.61*. 1) $3^{|x-2|} = 9$; 2) $4^{|x-2|} = 16$;

3) $8^{|x^2-1|} = 16$; 4) $27^{|x^2-2|} = 81$;

5) $2^{|x-2|} = 4^{|x+1|}$; 6) $5^{|x+4|} = 25^{|x|}$.

2.62*. 1) $(0,(3))^{6-x} = 27$; 2) $3^x \cdot (0,(3))^{x-3} = \left(\frac{1}{27}\right)^x$;

3) $0{,}25 \cdot (0{,}1(6))^{x-16} = 54$; 4) $\sqrt[3]{(0,(6))^x} = \sqrt[5]{1{,}5}$.

2.63*. 1) $3^{x-1} = \left(\frac{1}{7}\right)^{\sin^2 x + \cos^2 x - 1}$; 2) $0{,}26^{\operatorname{tg} x \operatorname{ctg} x - 1} = 6^{1+x}$;

3) $11^{1+\operatorname{tg}^2 x - \frac{1}{\cos^2 x}} = 0{,}11^{3+x}$; 4) $23^{x-1} = \left(\frac{7}{9}\right)^{1+\operatorname{ctg}^2 x - \frac{1}{\sin^2 x}}$.

2.64*. Запішыце найбольшы адмоўны корань ураўнення:

1) $\left(\frac{\pi}{2}\right)^{\cos x} = \sin\frac{\pi}{2}$; 2) $\left(\frac{3\pi}{2}\right)^{\sin x} = \cos 2\pi$.

Рашыце ўраўненне (**2.65—2.69**).

2.65*. 1) $\left(\frac{\pi}{6}\right)^{\sin^2 x} = \arccos\frac{\sqrt{3}}{2}$; 2) $\left(\frac{\pi}{4}\right)^{\cos^2 x} = \arcsin\frac{\sqrt{2}}{2}$;

3) $\left(\frac{\pi}{3}\right)^{\operatorname{tg}^2 x} = \operatorname{arctg}\sqrt{3}$; 4) $\left(\frac{\pi}{6}\right)^{\operatorname{ctg}^2 x} = \operatorname{arcctg}\sqrt{3}$.

2.66*. 1) $2^{\sin x} = \frac{1}{\sqrt{2}}$; 2) $3^{\cos 2x} = \frac{1}{\sqrt{3}}$;

3) $2^{\cos 2x} = \sqrt{0,5}$; 4) $5^{\sin 2x} = \sqrt{0,2}$;

5) $3^{\cos(\pi + 0,5x)} = \operatorname{ctg}\frac{4\pi}{3}$; 6) $8 \cdot 2^{\cos(1,5\pi + 0,4x)} = \sqrt{32}$.

2.67*. 1) $\left(\sqrt{3}\right)^{\operatorname{tg} 2x} = \frac{3\sqrt{3}}{3^{\operatorname{tg} 2x}}$; 2) $2^{\cos^2 x} = 8^{\sin^2 x}$;

3) $25^{1 - \cos 6x} = 5^{\frac{1}{\operatorname{ctg} 3x}}$; 4) $4 \cdot 3^{\cos x} + 3^{-\cos x} = 4\sqrt{2}$.

2.68*. 1) $3 \cdot 3^4 \cdot 3^7 \cdot ... \cdot 3^x = 3^{117}$;

2) $5^2 \cdot 5^4 \cdot 5^6 \cdot ... \cdot 5^{2x} = 0,04^{-28}$.

2.69*. 1) $2^{\cos x} \cdot 2^{\cos^2 x} \cdot 2^{\cos^3 x} \cdot ... = 2$;

2) $3^{\sin x} \cdot 3^{\sin^2 x} \cdot 3^{\sin^3 x} \cdot ... = 3$.

2.70*. Пры якіх значэннях a ураўненне:

1) $25^x + 5^x \cdot (2 - 3a) + 2a^2 - 5a - 3 = 0$ мае адно рашэнне;

2) $9^x - 3^x \cdot (5a + 3) + 6a^2 + 11a - 10 = 0$ мае адно рашэнне;

3) $4^x - 2^x \cdot (6a - 4) + 5a^2 - 4a = 0$ мае два рашэнні;

4) $36^x + 6^x \cdot (a - 1) - 2a^2 + a = 0$ мае два рашэнні?

2.71*. Рашыце сістэму ўраўненняў:

1) $\begin{cases} x + y = 6, \\ y^{x^2 - 7x + 12} = 1; \end{cases}$ 2) $\begin{cases} x - y = 3, \\ x^{y^2 - 5y + 6} = 1; \end{cases}$

3) $\begin{cases} 3^x - 2^{2y} = 77, \\ 3^{0,5x} - 2^y = 7; \end{cases}$ 4) $\begin{cases} 5^{\frac{x}{2}} + 3^y = 8, \\ 5^x - 3^{2y} = 16. \end{cases}$

2.4. Паказальныя няроўнасці

Разгледзім няроўнасці, у якіх зменная (невядомае) знаходзіцца ў паказчыку ступені. Напрыклад,

$$7^{3x^2 - x} < 7^{x^2 + 3x};$$

$$0,09 \leqslant 0,3^{x^2} < 1.$$

Няроўнасці такога выгляду прынята называць ***паказальнымі***.

З тэарэмы аб уласцівасцях паказальнай функцыі (п. 2.2, уласцівасць 8) атрымліваем вынік, які пастаянна выкарыстоўваецца пры рашэнні паказальных няроўнасцей.

Вынік. Няхай $a > 1$. Калі $a^s > a^t$, то $s > t$.
Няхай $0 < a < 1$. Калі $a^s > a^t$, то $s < t$.

Відарысы графікаў паказальнай функцыі падказваюць гэтую ўласцівасць. На рысунку 27 бачна, што пры $a > 1$ большаму значэнню функцыі адпавядае большае значэнне аргумента. А на рысунку 30 бачна, што пры $0 < a < 1$ большаму значэнню функцыі адпавядае меншае значэнне аргумента.

Пры рашэнні паказальных няроўнасцей, як і пры рашэнні паказальных ураўненняў, прыходзіцца выкарыстоўваць запіс абедзвюх частак няроўнасці ў выглядзе ступеней з адной і той жа асновай, раскладанне адной з частак няроўнасці на множнікі, увядзенне новай зменнай.

Прыклад 1. Рашыць няроўнасць $7^{3x^2 - x} < 7^{x^2 + 3x}$.

Рашэнне. Паколькі з дзвюх ступеней з асновай 7 большая тая, паказчык якой большы, то дадзеная няроўнасць раўназначна няроўнасці

$$3x^2 - x < x^2 + 3x.$$

Рэшым яе:

$$2x^2 - 4x < 0,$$
$$2x(x - 2) < 0,$$
$$0 < x < 2.$$

Адказ: (0; 2).

Прыклад 2. Рашыць няроўнасць $0{,}5^{2x - 3} \geqslant 0{,}25^{1 - x}$.

Рашэнне. Дадзеная няроўнасць раўназначна няроўнасці

$$0{,}5^{2x - 3} \geqslant 0{,}5^{2(1 - x)}.$$

Паколькі з дзвюх ступеней з аднолькавай асновай 0,5 большая тая, паказчык якой меншы, то маем:

$$2x - 3 \leqslant 2(1 - x),$$
$$4x \leqslant 5,$$
$$x \leqslant \frac{5}{4}.$$

Адказ: $(-\infty; 1{,}25]$.

Прыклад 3. Рашыць няроўнасць $5^{0,3x^2} + 2 \cdot 5^{0,3x^2+2} \leqslant 10,2.$

Рашэнне. Дадзеная няроўнасць раўназначна няроўнасці

$$5^{0,3x^2}(1 + 2 \cdot 5^2) \leqslant 10,2,$$

адкуль

$$5^{0,3x^2} \cdot 51 \leqslant 10,2,$$

$$5^{0,3x^2} \leqslant \frac{1}{5},$$

$$5^{0,3x^2} \leqslant 5^{-1}.$$

Паколькі з дзвюх ступеней з асновай 5 большая тая, паказчык якой большы, то дадзеная няроўнасць раўназначна няроўнасці

$$0,3x^2 \leqslant -1.$$

Рашэнняў няма, паколькі $0,3x^2 \geqslant 0$ пры любых значэннях x.

Адказ: няма рашэнняў.

Прыклад 4. Рашыць няроўнасць

$$7 \cdot 4^{x+1} + 5 \cdot 2^{2x} \leqslant 14 \cdot 2^{2x+1} + 40.$$

Рашэнне.

$$7 \cdot 4^{x+1} + 5 \cdot 2^{2x} - 14 \cdot 2^{2x+1} \leqslant 40 \Leftrightarrow 2^{2x}(7 \cdot 4 + 5 - 14 \cdot 2) \leqslant 40 \Leftrightarrow$$

$$\Leftrightarrow 2^{2x} \leqslant 8 \Leftrightarrow 2^{2x} \leqslant 2^3 \Leftrightarrow x \leqslant 1,5.$$

Адказ: $(-\infty;\ 1,5]$.

Прыклад 5. Рашыць няроўнасць $0,09 \leqslant 0,3^{x^2} < 1.$

Рашэнне. Дадзеную няроўнасць перапішам у выглядзе

$$0,3^2 \leqslant 0,3^{x^2} < 0,3^0.$$

Паколькі з дзвюх ступеней з асновай 0,3 большая тая, паказчык якой меншы, то маем:

$$2 \geqslant x^2 > 0,$$

$$0 < x^2 \leqslant 2,$$

$$0 < |x| \leqslant \sqrt{2},$$

$$-\sqrt{2} \leqslant x < 0 \text{ або } 0 < x \leqslant \sqrt{2}.$$

Адказ: $\left[-\sqrt{2};\ 0\right) \cup \left(0;\ \sqrt{2}\right]$.

Прыклад 6. Рашыць няроўнасць

$$5 \cdot 49^{5|x|-3} - 34 \cdot 7^{5|x|-3} - 7 \leqslant 0.$$

Рашэнне. Няхай $7^{5|x|-3}=t$, тады $49^{5|x|-3}=t^2$. Выкарыстаўшы гэтыя абазначэнні для дадзенай няроўнасці, атрымаем $5t^2-34t-7\leqslant 0$. Рашыўшы гэтую няроўнасць, атрымаем:

$$-\frac{1}{5}\leqslant t\leqslant 7,\ \text{г. зн.}\ \begin{cases} t\geqslant -\frac{1}{5},\\ t\leqslant 7.\end{cases}$$

Паколькі $t=7^{5|x|-3}>0$, то $t\geqslant -\frac{1}{5}$ пры любых значэннях x. Застаецца рашыць другую няроўнасць сістэмы:

$$7^{5|x|-3}\leqslant 7.$$

Атрымаем:

$$5|x|-3\leqslant 1 \Leftrightarrow 5|x|\leqslant 4 \Leftrightarrow |x|\leqslant \frac{4}{5} \Leftrightarrow -\frac{4}{5}\leqslant x\leqslant \frac{4}{5}.$$

Адказ: $\left[-\frac{4}{5};\ \frac{4}{5}\right]$.

▲**Прыклад 7.** Пры якіх значэннях m любое значэнне x з прамежку [9; 10] з'яўляецца рашэннем няроўнасці

$$3^{2x-m}<81?$$

Рашэнне.

$$3^{2x-m}<81 \Leftrightarrow 3^{2x-m}<3^4 \Leftrightarrow 2x-m<4 \Leftrightarrow x<\frac{4+m}{2}.$$

Для таго каб рашэннем няроўнасці $3^{2x-m}<81$ было любое значэнне x з прамежку [9; 10], неабходна, каб прамежак [9; 10] уваходзіў у множства рашэнняў дадзенай няроўнасці, г. зн. у прамежак $\left(-\infty;\ \frac{4+m}{2}\right)$ (рыс. 33).

Такім чынам, маем:

$$10<\frac{4+m}{2} \Leftrightarrow 20<4+m \Leftrightarrow m>16.$$



Рыс. 33

Адказ: пры $m>16$. ▲

?

1. Прывядзіце прыклады паказальных няроўнасцей.
2. Апішыце спосаб рашэння няроўнасцей выгляду:

а) $0{,}375^{f(x)}<0{,}375^{g(x)}$; б) $3{,}75^{f(x)}<3{,}75^{g(x)}$.

3. Апішыце спосаб рашэння няроўнасці выгляду

$$5\cdot 49^{f(x)}-34\cdot 7^{f(x)}-7\geqslant 0.$$

4. Апішыце спосаб рашэння няроўнасці выгляду

$$13 \cdot 6^{f(x)} + 7 \cdot 6^{f(x)+1} < 6^{f(x)+2} + 114.$$

5. Апішыце спосаб рашэння няроўнасці выгляду

$$343 \cdot 7^{g(x)} > \left(\sqrt[4]{7}\right)^{8f(x)}.$$

Практыкаванні

Рашыце няроўнасць (**2.72—2.86**).

2.72°. 1) $3^x > 9$; 2) $6^x < 36$;

3) $\left(\frac{1}{25}\right)^x < \frac{1}{25}$; 4) $\left(\frac{1}{4}\right)^x > \frac{1}{4}$;

5) $\left(\frac{1}{4}\right)^x \geqslant 2$; 6) $4^x \leqslant \frac{1}{2}$;

7) $2^{3x} \leqslant \frac{1}{8}$; 8) $5^{2x} \geqslant \frac{1}{25}$.

2.73°. 1) $5^{-x} < \sqrt{5}$; 2) $7^{-x} > \sqrt{7}$;

3) $\left(\frac{1}{12}\right)^{-\frac{x}{2}} > \sqrt[3]{12}$; 4) $\left(\frac{1}{10}\right)^{-\frac{x}{4}} > \sqrt[4]{10}$;

5) $9^{-5x} \leqslant \frac{1}{\sqrt[6]{3}}$; 6) $25^{-3x} \geqslant \frac{1}{\sqrt[5]{5}}$;

7) $10^{-\frac{2x}{7}} \geqslant 0{,}1$; 8) $0{,}01^{-\frac{4x}{5}} \leqslant 1000$.

2.74°. 1) $2^{x^2-4} \geqslant 1$; 2) $5^{x^2-16} \leqslant 1$;

3) $0{,}7^{x^2-27} < 0{,}7^9$; 4) $0{,}6^{x^2} > 0{,}36^2$;

5) $0{,}25^{-x^2+3x} < 256$; 6) $0{,}5^{-x^2-2x} > 8$;

7) $\left(\frac{7}{9}\right)^{2x^2-3x} \geqslant \frac{9}{7}$; 8) $\left(\frac{13}{11}\right)^{x^2-3x} \leqslant \frac{121}{169}$.

2.75. 1) $3^{x^2} > \left(\frac{1}{3}\right)^{2x-3}$; 2) $5^{4x+3} \leqslant \left(\frac{1}{25}\right)^{\frac{x^2}{2}}$;

3) $\left(\frac{1}{49}\right)^{2x} < \left(\sqrt{7}\right)^{x^2+3{,}75}$; 4) $\left(\frac{1}{2}\right)^{6\frac{1}{3}x} > 8^{2\frac{2}{3}-x^2}$;

5) $8 \cdot 2^{x^2-3x} \leqslant (0{,}5)^{-1}$; 6) $9 \cdot 3^{x^2-4x} \geqslant 3^{-1}$.

2.76. 1) $125 \cdot \left(\frac{1}{5}\right)^{3x^2} \leqslant \left(\frac{1}{25}\right)^{-4x}$; 2) $4 \cdot \left(\frac{1}{2}\right)^{5x^2} \geqslant \left(\frac{1}{8}\right)^{-3x}$;

3) $\sqrt{32} \cdot 2^{-4x^2} \geqslant 8^{3x}$; 4) $\sqrt{27} \cdot 3^{-6x^2} \leqslant 9^{4x}$;

5) $25 \cdot 0{,}04^{2x} > 0{,}2^{x(3-x)}$; 6) $4 \cdot 0{,}5^{x(x+3)} < 0{,}25^{2x}$.

2.77. 1) $5^{2-3x}-1\geqslant 0$; 2) $\left(\frac{1}{2}\right)^{2-4x}-1\leqslant 0$;

3) $\pi^{\frac{x-3}{x^2+1}}<1$; 4) $\left(\frac{\pi}{2}\right)^{\frac{x+5}{x^2-9}}>1$;

5) $\left(\frac{3\pi}{2}\right)^{\frac{x^2-4}{x-1}}\geqslant 1$; 6) $\left(\frac{2\pi}{3}\right)^{\frac{x^2-16}{x+3}}\leqslant 1$.

2.78. 1) $(0{,}5)^{1-\frac{3}{x}}\geqslant 8\cdot(0{,}5)^x$; 2) $2^{1+\frac{8}{x}}\geqslant 0{,}5\cdot 2^x$;

3) $(0{,}3)^{\frac{x+2}{x-1}}<(0{,}3)^{\frac{2}{x-1}}$; 4) $(0{,}1)^{\frac{x-3}{x+1}}>10^{\frac{3}{x+1}}$;

5) $(0{,}4)^{\frac{3x-1}{x+1}}\leqslant(2{,}5)^{x+1}$; 6) $(0{,}5)^{\frac{3x-4}{x-2}}<2^{x-2}$;

7) $(0{,}5)^{\frac{x^2-4}{x}}>8$; 8) $(0{,}2)^{\frac{x^2-3}{x}}<25$.

2.79. 1) $5^{|x+2|}>625$; 2) $9^{|x-4|}<81$;

3) $\left(\frac{2}{3}\right)^{|x+3|}\geqslant\left(\frac{3}{2}\right)^{-x}$; 4) $\left(\frac{4}{9}\right)^{|x-9|}\leqslant\left(\frac{9}{4}\right)^{-x}$;

5) $2^{|2x+3|}\geqslant 2^{|4x-1|}$; 6) $10^{|2x+5|}\leqslant 10^{|7-x|}$.

2.80. 1) $5^{\sqrt{3x-6}}<125$; 2) $4^{\sqrt{4x-1}}>64$;

3) $3^{\sqrt{-x^2-3x+4}}>9$; 4) $7^{\sqrt{x^2+x+1}}<7$.

2.81*. 1) $3^{\sqrt{3x+4}}\geqslant\frac{1}{3^x}$; 2) $2^{\sqrt{24-5x}}\geqslant 2^x$;

3) $\left(\frac{1}{5}\right)^{\sqrt{x^2+x-12}}\geqslant 5^x$; 4) $6^{\sqrt{7+3x}}\geqslant\frac{6}{6^x}$.

2.82*. 1) $5^{\cos x}>1$; 2) $6^{\sin x}<1$;

3) $\left(\frac{3}{7}\right)^{\sin x}\leqslant 1$; 4) $\left(\frac{5}{11}\right)^{\cos x}\geqslant 1$;

5) $2{,}6^{\operatorname{tg}x}<1$; 6) $0{,}54^{\operatorname{ctg}x}<1$;

7) $0{,}13^{\operatorname{ctg}x}\geqslant 1$; 8) $9{,}68^{\operatorname{tg}x}\geqslant 1$.

2.83*. 1) $0{,}7^{\sin x}<1\frac{3}{7}$; 2) $0{,}4^{\cos x}>\frac{2}{5}$;

3) $6{,}2^{\cos x}\geqslant 6\frac{1}{5}$; 4) $7{,}4^{\sin x}\leqslant\frac{5}{37}$;

5) $4{,}5^{\operatorname{tg}x}\leqslant\frac{2}{9}$; 6) $0{,}65^{\operatorname{ctg}x}\geqslant\frac{13}{20}$;

7) $0{,}24^{\operatorname{ctg}x}>\frac{6}{25}$; 8) $3{,}6^{\operatorname{tg}x}<\frac{5}{18}$.

2.84°. 1) $3^{x+2} + 3^{x-1} < 28$;
2) $2^{x-1} + 2^{x+3} > 17$;
3) $3^{2x+2} - 3^{2x-1} \geqslant 78$;
4) $5^{3x+1} - 5^{3x-3} \leqslant 624$;
5) $2^{2x-1} + 2^{2x-2} + 2^{2x-3} \geqslant 448$;
6) $3^{2x-2} + 3^{2x-1} - 3^{2x-4} \leqslant 315$;
7) $2^{x-2} + 8^{\frac{1}{3}x-1} - 4^{\frac{1}{2}x-2} < 10$;
8) $4^{x} - 2^{2x-2} + 8^{\frac{2(x-2)}{3}} > 52$;
9) $2^{x-1} + 2^{x-2} - 3 \cdot 2^{x-3} \geqslant 3 \cdot 4^{\frac{2}{x}}$;
10) $3^{x+3} + 3^{x+2} - 2 \cdot 3^{x+1} \leqslant 10 \cdot 9^{\frac{1}{x}}$.

2.85. 1) $2^{2x} - 3 \cdot 2^{x} + 2 \leqslant 0$; 2) $3^{2x} - 4 \cdot 3^{x} + 3 < 0$;
3) $9^{x} - 3^{x} - 6 > 0$; 4) $4^{x} - 2^{x} < 12$;
5) $5^{2x+1} + 4 \cdot 5^{x} - 1 \leqslant 0$; 6) $3^{2x+1} + 11 \cdot 3^{x} \geqslant 4$;
7) $3^{2x+2} - 3^{x+4} > 3^{x} - 9$; 8) $9^{x+1} - 3^{x+3} \geqslant 3^{x} - 3$.

2.86. 1) $0{,}04 < 5^{x} < 125$; 2) $\frac{1}{36} < 6^{x} < 36$;
3) $\frac{1}{27} < \left(\sqrt{3}\right)^{x} < 81 \cdot \sqrt[5]{9}$; 4) $\frac{1}{32} < \left(\sqrt{2}\right)^{x} < 64 \cdot \sqrt[4]{4}$;
5) $0{,}125 < 5^{x^2} < 5$; 6) $0{,}0081 < 0{,}3^{x^2} < 1$;
7) $0{,}16 < 0{,}4^{2x-1} < 1$; 8) $0{,}00032 < 0{,}2^{4x-2} < 1$.

2.87. Рашыце сістэму няроўнасцей:

1) $\begin{cases} 6^{2x} \leqslant \frac{1}{36}, \\ x^2 + x - 2 > 0; \end{cases}$ 2) $\begin{cases} 3^{3-x} \geqslant 9, \\ x^2 - 2x - 3 > 0; \end{cases}$

3) $\begin{cases} 5^{2-3x} - 1 > 0, \\ x^2 - x - 6 < 0; \end{cases}$ 4) $\begin{cases} \left(\frac{1}{4}\right)^{x+3} - 2 > 0, \\ x^2 - x - 20 < 0; \end{cases}$

5)* $\begin{cases} 3^{x} - 7 > 2, \\ x + 8 < 3 \text{ або } 2x + 4 \geqslant 5; \end{cases}$

6)* $\begin{cases} 4^{x} - 10 < 6, \\ 4x - 1 < -5 \text{ або } 2x + 3 > 5. \end{cases}$

2.88. Знайдзіце натуральны абсяг вызначэння выразу:

1) $\sqrt[6]{9^{\frac{1}{x}} - \sqrt{3^x}}$; 2) $\sqrt[8]{\sqrt{2^x} - 32^{\frac{1}{x}}}$;

3) $\sqrt{\frac{19}{4^{x+3}} - \frac{12}{4^{x-4}}}$; 4) $\sqrt{\frac{1}{2^x+3} - \frac{1}{2^{x+1}+1}}$.

2.89*. Дакажыце, што пры любых значэннях x правільная няроўнасць:

1) $0{,}09^{\sin^2 x + \cos^2 x - 1} \geqslant \left(\frac{1}{9}\right)^{x^2}$;

2) $7{,}3^{\sin^2 x - 3} \leqslant \left(\frac{3}{7}\right)^{1 + \cos x - 2\cos^2 \frac{x}{2}}$;

3) $\left(\frac{4}{5}\right)^{1 - 2\sin^2 \frac{x}{2} - \cos x} \geqslant 4{,}5^{\cos^2 x - 5}$;

4) $0{,}07^{\cos^2 x - \sin^2 x - \cos 2x} \geqslant \left(\frac{1}{7}\right)^{x^4}$.

2.90*. 1) Пры якіх значэннях a любое значэнне x, большае за -1, з'яўляецца рашэннем няроўнасці $5^{x+a} > 125$?

2) Пры якіх значэннях a любое значэнне x, меншае за 1, з'яўляецца рашэннем няроўнасці $4^{x+a} < 16$?

2.5. Лагарыфмы

Мноствам (абсягам) значэнняў паказальнай функцыі $y = a^x$ ($a > 0$, $a \neq 1$) з'яўляецца мноства ўсіх дадатных лікаў. Значыць, для любога дадатнага ліку b знойдзецца такое значэнне аргумента c, што

$$a^c = b.$$

Такое значэнне аргумента адзінае, паколькі калі $b = a^c$ і $b = a^d$, то па выніку з п. 2.3 будзе правільнай роўнасць $c = d$. Гэта адзінае значэнне аргумента c называюць ***лагарыфмам ліку b па аснове a*** і абазначаюць $\log_a b$, г. зн.

$$c = \log_a b.$$

Такім чынам, роўнасць $c = \log_a b$ азначае, што $b = a^c$. Сфармулюем азначэнне лагарыфма яшчэ раз.

Азначэнне. **Няхай $a > 0$, $a \neq 1$, $b > 0$. *Лагарыфмам ліку b па аснове a* называецца паказчык ступені, у якую трэба ўзвесці лік a, каб атрымаць лік b.**

Прывядзём некалькі прыкладаў:

а) $\log_5 125 = 3$, паколькі $125 = 5^3$;

б) $\log_5 \frac{1}{125} = -3$, паколькі $\frac{1}{125} = 5^{-3}$;

в) $\log_{\frac{1}{3}} \frac{1}{81} = 4$, паколькі $\frac{1}{81} = \left(\frac{1}{3}\right)^4$;

г) $\log_7 1 = 0$, паколькі $1 = 7^0$;

д) $\log_5 (-9)$ не мае сэнсу, паколькі значэнне выразу 9^x пры любых значэннях x дадатнае і не можа быць роўным -9;

е) па азначэнні лагарыфма не маюць сэнсу і такія выразы, як $\log_{-2} 4$, $\log_0 1$, $\log_1 3$, $\log_1 1$, паколькі асновай лагарыфма павінен быць дадатны лік, адрозны ад адзінкі.

Знаходжанне лагарыфма ліку называецца ***лагарыфмаваннем***.

Абазначым $\log_a b = s$. Тады згодна з азначэннем лагарыфма будзе правільнай роўнасць $a^s = b$, г. зн.

$$\boldsymbol{a^{\log_a b} = b.}$$

Гэтая роўнасць называецца ***асноўнай лагарыфмічнай тоеснасцю***.

Згодна з гэтай тоеснасцю, напрыклад, маем:

$$5^{\log_5 125} = 125; \qquad 5^{\log_5 \frac{1}{125}} = \frac{1}{125}; \qquad \frac{1}{3}^{\log_{\frac{1}{3}} \frac{1}{81}} = \frac{1}{81}; \qquad 7^{\log_7 1} = 1.$$

! Асноўная лагарыфмічная тоеснасць дазваляе дадзены лік b запісваць у выглядзе ступені з любой дадатнай асновай.

Напрыклад:

$$17 = 3^{\log_3 17} = 0{,}11^{\log_{0,11} 17} = \left(\frac{2}{3}\right)^{\log_{\frac{2}{3}} 17}.$$

Лагарыфмы былі вынайдзены ў 1614 г. шатландскім матэматыкам Дж. Неперам (1550—1617) і незалежна ад яго на шэсць гадоў пазней швейцарскім механікам і матэматыкам І. Бюргі (1552—1632).

Абодва даследчыкі хацелі знайсці зручны сродак арыфметычных вылічэнняў, але іх азначэнні лагарыфма розныя і ў абодвух непадобныя на сучасныя.

Разуменне лагарыфма як паказчыка ступені з дадзенай асновай упершыню з'явілася ўжо ў XVIII ст. у працах англійскага матэматыка В. Гардынера (1742 г.). Шырокаму распаўсюджанню гэтага азначэння лагарыфма больш за іншых спрыяў Л. Эйлер, які ўпершыню выкарыстаў у гэтай сувязі і тэрмін «аснова».

Тэрмін «лагарыфм» належыць Неперу. Ён узнік са спалучэння грэчаскіх слоў *логас* — *адносіна* і *арытмас* — *лік*. Слова «лагарыфм», такім чынам, азначала «лік адносіны».

Прыклад 1. а) Запісаць лік $\sqrt{3}$ у выглядзе лагарыфмаў па аснове 3; $\frac{3}{2}$; $\sqrt{7}$.

б) Запісаць лік -5 у выглядзе лагарыфмаў па аснове $\frac{1}{4}$ і x ($x > 0$; $x \neq 1$).

Рашэнне. а) Па азначэнні лагарыфма маем:

$$\sqrt{3} = \log_3 3^{\sqrt{3}},$$
$$\sqrt{3} = \log_{\frac{3}{2}} \left(\frac{3}{2}\right)^{\sqrt{3}},$$
$$\sqrt{3} = \log_{\sqrt{7}} \left(\sqrt{7}\right)^{\sqrt{3}}.$$

б) Па азначэнні лагарыфма маем:

$$-5 = \log_{\frac{1}{4}} \left(\frac{1}{4}\right)^{-5} = \log_{\frac{1}{4}} 4^5 = \log_{\frac{1}{4}} 1024;$$
$$-5 = \log_x x^{-5} = \log_x \frac{1}{x^5}.$$

Прыклад 2. Паміж якімі цэлымі лікамі знаходзіцца лік $\log_2 17$?

Рашэнне. Няхай $\log_2 17 = p$, тады правільная роўнасць $2^p = 17$. Паколькі $2^4 = 16 < 17 = 2^p$ і $2^p = 17 < 32 = 2^5$, то $2^4 < 2^p < 2^5$. Па ўласцівасцях паказальнай функцыі з асновай 2 маем $4 < p < 5$. Значыць, $\log_2 17$ знаходзіцца паміж лікамі 4 і 5.

Адказ: $4 < \log_2 17 < 5$.

Прыклад 3. Рашыць ураўненне:

а) $3^x = 2$; б) $3^x = 2^{x-1}$.

Рашэнне. а) Паколькі $3^x = 2$, то па азначэнні лагарыфма маем

$$x = \log_3 2.$$

б) $3^x = 2^{x-1} \Leftrightarrow 3^x = \frac{2^x}{2} \Leftrightarrow \left(\frac{2}{3}\right)^x = 2 \Leftrightarrow x = \log_{\frac{2}{3}} 2.$

Адказ: а) $\log_3 2$; б) $\log_{\frac{2}{3}} 2$.

Лагарыфмы па аснове 10 маюць асобую назву — ***дзесятковыя лагарыфмы***.
Дзесятковы лагарыфм ліку b абазначаецца $\lg b$.
Такім чынам, $\lg b = \log_{10} b$.

▲ Асобае абазначэнне і назву маюць не толькі дзесятковыя лагарыфмы, але і лагарыфмы, асновай якіх з'яўляецца лік e:

$$\log_e b = \ln b.$$

Такія лагарыфмы называюцца ***натуральнымі***.
Лагарыфмы па аснове e дазваляюць выражаць матэматычную залежнасць, якая характарызуе многія біялагічныя, хімічныя, фізічныя, сацыяльныя і іншыя працэсы. Відаць, гэтым і тлумачыцца назва «натуральныя лагарыфмы», г. зн. прыродныя (гэты тэрмін увёў у 1659 г. італьянскі матэматык П. Менголі).
Натуральныя і дзесятковыя лагарыфмы мелі вялікае значэнне для палягчэння вылічэнняў у XVII—XX стст. да стварэння магутных сучасных вылічальных сродкаў. Натуральныя лагарыфмы маюць і вялікае тэарэтычнае значэнне. ▲

1. Сфармулюйце азначэнне лагарыфма.
2. Сфармулюйце асноўную лагарыфмічную тоеснасць.
3. Як абазначаюцца і называюцца лагарыфмы па аснове 10?
4. Дакажыце, што пры любым $a > 1$:

   а) $\log_a 1 = 0$;   б) $\log_a a = 1$.

Практыкаванні

2.91°. У якую ступень трэба ўзвесці лік 10, каб атрымаць лік:

1) 100; 2) 10 000; 3) 1000;
4) 10; 5) 1; 6) 0,1;
7) 0,001; 8) $\frac{1}{10000}$; 9) $\frac{1}{10^7}$;
10) $\sqrt{10}$; 11) $\frac{1}{\sqrt[5]{10}}$; 12) $\frac{1}{\sqrt[7]{100}}$?

2.92°. Запішыце роўнасць з дапамогай лагарыфма па ўзоры $7^{-2} = \frac{1}{49}$, г. зн. $-2 = \log_7 \frac{1}{49}$:

1) $2^3 = 8$; 2) $3^4 = 81$;
3) $10^3 = 1000$; 4) $64^{\frac{1}{3}} = 4$;
5) $3^1 = 3$; 6) $6^0 = 1$;
7) $0{,}11^2 = 0{,}0121$; 8) $2{,}1^2 = 4{,}41$;
9) $\left(\frac{1}{2}\right)^{-4} = 16$; 10) $\left(\frac{1}{3}\right)^{-3} = 27$;
11) $\left(\frac{3}{13}\right)^{-1} = \frac{13}{3}$; 12) $\left(\frac{9}{20}\right)^{-1} = \frac{20}{9}$.

2.93°. Запішыце лікі 0; −1; 1;−2; 2; −0,3; 0,3; $-\sqrt{2}$; $\sqrt{2}$ у выглядзе лагарыфма па аснове:

1) 7; 2) 5; 3) $\frac{1}{4}$; 4) $\frac{1}{6}$;
5) 0,11; 6) 0,2; 7) 2,5; 8) 1,3.

2.94. Запішыце ў выглядзе лагарыфмаў з асновамі 0,1; 2; $\frac{1}{3}$; x ($x > 0$; $x \neq 1$); $x - 2$ ($x > 2$; $x \neq 3$); m^2 ($m \neq 0$; $|m| \neq 1$) лік:

1) −2; 2) −3; 3) −1; 4) $-\frac{1}{2}$;
5) 3; 6) 2; 7) $-\frac{1}{3}$; 8) 1;
9) $\frac{1}{2}$; 10) $\frac{1}{3}$; 11) 0; 12) 10.

2.95°. Знайдзіце лагарыфм ліку па аснове 3:

1) 9; 2) 1; 3) $\frac{1}{27}$; 4) $\frac{1}{81}$;
5) $\frac{1}{\sqrt{3}}$; 6) $\sqrt[3]{3}$; 7) $\sqrt[5]{9}$; 8) $3^{\sqrt{3}}$.

2.96°. Знайдзіце лік, лагарыфм якога па аснове 3 роўны:

1) 0; 2) 1; 3) −1; 4) −3;
5) 2; 6) 3; 7) $\frac{1}{2}$; 8) $\frac{1}{4}$.

2.97. Знайдзіце a, калі $\log_a \frac{1}{16}$ роўны:

1) 1; 2) 2; 3) 4; 4) −4;
5) −1; 6) −2; 7) $-\frac{1}{2}$; 8) $\frac{1}{2}$.

Вылічыце (**2.98—2.105**).

2.98°. 1) $\log_2 16$; 2) $\log_2 2$; 3) $\log_2 64$;
4) $\log_2 1$; 5) $\log_2 \frac{1}{2}$; 6) $\log_2 \frac{1}{8}$;
7) $\log_2 \frac{1}{64}$; 8) $\log_2 \frac{1}{512}$; 9) $\log_2 \left(2\sqrt[8]{2}\right)$.

2.99°. 1) $\log_3 81$; 2) $\log_3 27$; 3) $\log_3 \frac{1}{3}$;
4) $\log_3 1$; 5) $\log_3 \frac{1}{9}$; 6) $\log_3 3$;
7) $\log_3 243$; 8) $\log_3 \frac{1}{243}$; 9) $\log_3 \left(3\sqrt[10]{9}\right)$.

2.100°. 1) $\log_{\frac{1}{2}} 4$; 2) $\log_{\frac{1}{2}} 1$; 3) $\log_{\frac{1}{2}} 0{,}125$;
4) $\log_{\frac{1}{2}} \frac{1}{2}$; 5) $\log_{\frac{1}{2}} \sqrt[3]{2}$; 6) $\log_{\frac{1}{2}} \frac{1}{32}$;
7) $\log_{\frac{1}{2}} 128$; 8) $\log_{\frac{1}{2}} \sqrt[8]{2}$; 9) $\log_{\frac{1}{2}} \frac{1}{2\sqrt{2}}$.

2.101. 1) $\log_6 \sin \frac{\pi}{2}$; 2) $\log_4 \sin \frac{\pi}{6}$;
3) $\log_{0,25} \cos \frac{\pi}{4}$; 4) $\log_{\frac{1}{8}} \cos \frac{\pi}{3}$;
5) $\log_{\frac{1}{3}} \operatorname{tg} \frac{4\pi}{3}$; 6) $\log_{0,5} \operatorname{ctg} \frac{5\pi}{4}$;
7) $\log_3 \operatorname{ctg}(-150°)$; 8) $\log_{\frac{1}{3}} \operatorname{tg}(-120°)$.

2.102. 1) $\log_{16} \sqrt{2\operatorname{tg} \frac{3\pi}{4} - 8\cos \frac{4\pi}{3}}$;
2) $\log_{\sqrt{2}} \sqrt{3\operatorname{tg} \frac{5\pi}{4} + 2\sin \frac{7\pi}{6}}$;
3) $\log_2 \sqrt{6\sin \frac{5\pi}{6} + 2\cos \frac{5\pi}{3}}$;
4) $\log_3 \sqrt{4\sin \frac{19\pi}{3} - 2\cos \frac{5\pi}{6}}$.

2.103°. 1) $3^{\log_3 18}$; 2) $5^{\log_5 10}$; 3) $10^{\log_{10} 1}$;
4) $4^{\log_4 8}$; 5) $2^{\log_2 1}$; 6) $12^{\log_{12} 100}$;
7) $7^{\log_7 7}$; 8) $\left(\frac{1}{4}\right)^{\log_{\frac{1}{4}} 6}$; 9) $\left(\frac{3}{16}\right)^{\log_{\frac{3}{16}} \frac{18}{5}}$.

2.104. 1) $\left(2^{\log_2 5}\right)^2$; 2) $\left(6^{\log_6 2}\right)^4$; 3) $25^{\log_5 3}$;

4) $4^{\log_2 6}$; 5) $3^{-\log_3 3}$; 6) $4^{-\log_4 16}$;

7) $27^{-\log_3 2}$; 8) $\left(\frac{1}{8}\right)^{\log_2 \frac{1}{3}}$; 9) $\left(\frac{1}{125}\right)^{\log_5 10}$.

2.105. 1) $2^{2+\log_2 5}$; 2) $3^{2+\log_3 10}$; 3) $5^{2-\log_5 10}$;
4) $25^{1-\log_{25} 15}$; 5) $5 \cdot 3^{\log_3 4 - 1}$; 6) $4 \cdot 5^{\log_5 10 - 2}$;

7) $27^{\log_3 6 - 1}$; 8) $\left(\frac{1}{8}\right)^{\log_2 5 + 1}$; 9) $\left(\frac{1}{100}\right)^{\lg \frac{1}{2} - 2}$.

2.106. Знайдзіце значэнне выразу:

1) $\log_{\frac{1}{3}}(\log_3 27)$; 2) $\log_3\left(\log_{\frac{1}{5}} \frac{1}{125}\right)$;

3) $\log_2\left(\log_5 \sqrt[8]{5}\right)$; 4) $\log_4\left(\log_3 \sqrt{81}\right)$;

5) $\log_3(3\log_2 8)$; 6) $\log_3(3\log_3 27)$;

7) $\log_6(3\log_2 4)^3$; 8) $\lg(5\lg 100)^2$.

2.107. Вылічыце:

1) $2\log_5 25 + 3\log_2 64$; 2) $4\log_6 216 - 2\log_{0,5} 8$;

3) $2\log_2 \frac{1}{4} - 3\log_{\frac{1}{3}} 27$; 4) $5\log_{\frac{1}{5}} 625 + 8\log_4 1$;

5) $\log_4 \log_{16} 256 + \log_4 2$; 6) $\log_2 \log_4 16 + \log_{\frac{1}{2}} 2$;

7) $\frac{2}{5} \cdot \left(\log_3 81 + 16^{\log_2 3}\right)^{\log_{85} 25}$;

8) $\frac{1}{3} \cdot \left(\lg 10 + 9^{\log_3 7}\right)^{\log_{50} 3}$;

9) $3^{\log_2 \frac{1}{4} + \log_3 5}$;

10) $9^{\log_9 2 + \log_5 \frac{1}{25}}$.

Рашыце ўраўненне (**2.108—2.110**).

2.108°. 1) $\log_3 x = 3$; 2) $\lg x = 1$; 3) $\log_5 x = 1$;
4) $\lg x = 0$; 5) $\log_4 x = 2$; 6) $\log_7 x = -2$;

7) $\lg x = -1$; 8) $\log_{0,1} x = -2$; 9) $\log_8 x = -\frac{1}{3}$.

2.109. 1) $\log_x 16 = 2$; 2) $\log_x 5 = -1$; 3) $\log_x 81 = -4$;

4) $\log_x\left(2\sqrt{2}\right) = \frac{3}{2}$; 5) $\log_x 64 = 6$; 6) $\log_x 36 = -2$;

7) $\log_x \frac{1}{125} = -3$; 8) $\log_x \frac{1}{8} = \frac{3}{2}$; 9) $\log_x 1 = 2$;

10) $\log_x 16 = 4$; 11) $\log_x 1 = -3$; 12) $\log_x \frac{5}{7} = -1$.

2.110. 1) $4^x = 5$; 2) $6^x = 2$; 3) $5^{x-1} = 8$;

4) $\left(\frac{1}{2}\right)^{x+1} = 6$; 5) $7^{x+1} = 3^x$; 6) $8^{x-2} = 10^x$;

7) $\left(\frac{1}{3}\right)^{x-1} = 5^x$; 8) $2^{x-1} = \left(\frac{1}{5}\right)^x$; 9) $3^x = \left(\frac{3}{8}\right)^{x+1}$.

2.111. Ці мае сэнс выраз:

1) $\log_2\left(3 - 2\sqrt{2}\right)$; 2) $\log_4\left(5 - 3\sqrt{2}\right)$;

3) $\log_{2-\sqrt{5}} 4$; 4) $\log_{3-\sqrt{10}} \frac{7}{8}$;

5) $\log_{\sin\frac{\pi}{2}} (\pi - 1)$; 6) $\log_{\cos 2\pi} (4 - \pi)$;

7) $\sqrt{\log_2 0{,}6}$; 8) $\sqrt{\log_4 0{,}9}$?

2.112. Паміж якімі цэлымі лікамі знаходзіцца лік:

1) $\log_3 15$; 2) $\log_6 200$; 3) $\log_{0,5} 1000$;

4) $\log_{\frac{1}{3}} 10$; 5) $\log_5 \frac{1}{8}$; 6) $\log_{\frac{1}{4}} \frac{12}{13}$?

2.6. Асноўныя ўласцівасці лагарыфмаў

Тэарэма 1. Пры любых дадатных значэннях b і c правільныя роўнасці:

$$\log_a(bc) = \log_a b + \log_a c; \quad (1)$$

$$\log_a \frac{b}{c} = \log_a b - \log_a c. \quad (2)$$

Доказ. Дакажам сцверджанне (1).

Па асноўнай лагарыфмічнай тоеснасці

$$a^{\log_a(bc)} = bc = a^{\log_a b} \cdot a^{\log_a c} =$$

↓ па ўласцівасцях ступені ↓

$$= a^{\log_a b + \log_a c}.$$

Такім чынам, маем:

$$a^{\log_a(bc)} = a^{\log_a b + \log_a c}.$$

Адсюль па выніку з п. 2.3 атрымліваем роўнасць (1).

Дакажам сцверджанне (2).

Пераўторым левую частку роўнасці (2):

$$\log_a \frac{b}{c} = \log_a \frac{b}{c} + \log_a c - \log_a c =$$

↓ выкарыстаўшы роўнасць (1), атрымаем ↓

$$= \log_a\left(\frac{b}{c}\cdot c\right) - \log_a c = \log_a b - \log_a c. \boxtimes$$

Заўважым, што роўнасць (2) можна даказаць тым жа спосабам, што і роўнасць (1), — зрабіце гэта самастойна.

Роўнасць (1) азначае, што *лагарыфм здабытку двух дадатных лікаў роўны суме лагарыфмаў гэтых лікаў.*

Роўнасць (2) азначае, што *лагарыфм дробу з дадатнымі лічнікам і назоўнікам роўны рознасці лагарыфмаў лічніку і назоўніку.*

Заўвага. Роўнасці, даказаныя ў тэарэме 1 (як і іншыя роўнасці гэтага пункта), з'яўляюцца тоеснасцямі. Сапраўды, кожная з іх ператвараецца ў правільную лікавую роўнасць пры любых значэннях a, b і c, для якіх выразы, што ўваходзяць у роўнасць, маюць сэнс.

Тэарэма 2. Пры любых значэннях s і дадатных значэннях b правільная роўнасць

$$\log_a b^s = s\log_a b. \quad (3)$$

Доказ. Па асноўнай лагарыфмічнай тоеснасці

$$a^{\log_a b^s} = b^s = \left(a^{\log_a b}\right)^s =$$

↓ па ўласцівасцях ступені ↓

$$= a^{s\log_a b}.$$

Такім чынам, маем

$$a^{\log_a b^s} = a^{s\log_a b}.$$

Адсюль па выніку з 2.3 атрымліваем роўнасць (3). ☒

Вынік 1. Калі лікі u і v аднаго знака, то мае месца роўнасць

$$\log_a (uv) = \log_a |u| + \log_a |v|. \quad (4)$$

Вынік 2. Пры любым цэлым k і $u \neq 0$ мае месца роўнасць

$$\log_a u^{2k} = 2k\log_a |u|. \quad (5)$$

Дакажыце гэтыя роўнасці самастойна.

Прыклад 1. Знайсці значэнне выразу:

а) $\log_2 60 - \log_2 15$; б) $\lg 125 + \lg 8$; в) $\log_3 243$.

Рашэнне.

а) $\log_2 60 - \log_2 15 = \log_2 \frac{60}{15} = \log_2 4 = 2$;

б) $\lg 125 + \lg 8 = \lg (125 \cdot 8) = \lg 1000 = 3$;

в) $\log_3 243 = \log_3 3^5 = 5 \log_3 3 = 5$.

Адказ: а) 2; б) 3; в) 5.

Тэарэма 3. Пры любых значэннях $a > 0$, $a \neq 1$, $b > 0$, $b \neq 1$ і $c > 0$ правільная роўнасць

$$\log_b c = \frac{\log_a c}{\log_a b}. \qquad (6)$$

Доказ. *Спосаб* 1. Па асноўнай лагарыфмічнай тоеснасці маем

$$b^{\log_b c} = c.$$

Пралагарыфмаваўшы левую і правую часткі гэтай тоеснасці па аснове a, атрымаем

$$\log_a \left(b^{\log_b c}\right) = \log_a c.$$

Прымяніўшы тоеснасць (3), маем

$$\log_b c \cdot \log_a b = \log_a c.$$

Паколькі $b \neq 1$, то $\log_a b \neq 0$. Таму левую і правую часткі гэтай роўнасці можна раздзяліць на $\log_a b$. У выніку атрымаем тоеснасць (6). ☒

Спосаб 2. Няхай $\log_b c = x$, тады $c = b^x$. Пралагарыфмаваўшы абедзве часткі гэтай роўнасці па аснове a, атрымаем

$$\log_a c = \log_a b^x, \text{ г. зн. } \log_a c = x \log_a b.$$

Адкуль маем

$$x = \frac{\log_a c}{\log_a b}.$$

Такім чынам, $\log_b c = \frac{\log_a c}{\log_a b}$. ☒

Тоеснасць (6) называецца ***формулай пераходу ад лагарыфма па адной аснове да лагарыфма па другой аснове***.

Звычайна ў табліцах, калькулятарах даюцца значэнні лагарыфмаў па аснове 10, а калі трэба знайсці значэнне лагарыфма па іншай аснове, карыстаюцца формулай пераходу ад лагарыфма па адной аснове да лагарыфма па другой аснове.

Вынікам з тоеснасці (6) пры аснове $a = c$ з'яўляецца формула

$$\log_b a = \frac{1}{\log_a b} \qquad (7)$$

(пераканайцеся ў гэтым самастойна).

Прыклад 2. Знайсці значэнне выразу, калі $\log_3 p = m$:

а) $\log_{\sqrt{3}} p^2 - \log_{\frac{1}{3}} p + \log_9 \sqrt{p}$;

б) $\log_{\sqrt{3}} p^4 - \log_4 13 \cdot \log_{13} 4 + 1$.

Рашэнне. а) $\log_{\sqrt{3}} p^2 - \log_{\frac{1}{3}} p + \log_9 \sqrt{p} =$

↓ згодна з тоеснасцю (6) маем ↓

$$= \frac{\log_3 p^2}{\log_3 \sqrt{3}} - \frac{\log_3 p}{\log_3 \frac{1}{3}} + \frac{\log_3 \sqrt{p}}{\log_3 9} =$$

↓ выкарыстаўшы тоеснасць (3), атрымаем ↓

$$= \frac{2\log_3 p}{\frac{1}{2}} - \frac{\log_3 p}{-1} + \frac{\frac{1}{2}\log_3 p}{2} =$$

$$= 4\log_3 p + \log_3 p + \frac{1}{4}\log_3 p =$$

↓ выкарыстаўшы тоеснасць (1), маем↓

$$= \frac{21}{4}\log_3 p =$$

↓ з улікам умовы $\log_3 p = m$ маем↓

$$= 5{,}25m.$$

б) $\log_{\sqrt{3}} p^4 - \log_4 13 \cdot \log_{13} 4 + 1 =$

↓ выкарыстаўшы тоеснасці (6) і (7), атрымаем ↓

$$= \frac{\log_3 p^4}{\log_3 \sqrt{3}} - 1 + 1 =$$

↓ па тоеснасці (3) і з улікам умовы маем ↓

$$= \frac{4\log_3 p}{\frac{1}{2}} = 8m.$$

Адказ: а) $5{,}25m$; б) $8m$.

Вынік 3. Маюць месца тоеснасці:

а) $\log_{a^q} b^p = \frac{p}{q}\log_a b;$ (8)

б) $a^{\log_c b} = b^{\log_c a}.$ (9)

Тоеснасці (8) і (9) можна даказаць, выкарыстаўшы ўжо даказаныя тоеснасці з гэтага пункта.

Прыклад 3. Спрасціць выраз $A = \dfrac{1}{3 - \log_2 \frac{8}{9}}$.

Рашэнне. Выкарыстаўшы азначэнне лагарыфма, пакажам лікі 1 і 3 у выглядзе лагарыфмаў па аснове 2:

$$A = \frac{1}{3 - \log_2 \frac{8}{9}} = \frac{\log_2 2}{\log_2 8 - \log_2 \frac{8}{9}} =$$

↓ па ўласцівасці (2) лагарыфмаў маем ↓

$$= \frac{\log_2 2}{\log_2 \frac{8 \cdot 9}{8}} = \frac{\log_2 2}{\log_2 9} =$$

↓ выкарыстаўшы формулу (7), атрымаем ↓

$$= \log_9 2.$$

Адказ: $A = \log_9 2$.

Развіццё навукі, перш за ўсё астраноміі, ужо ў XVI ст. прывяло да неабходнасці грувасткіх вылічэнняў пры множанні і дзяленні шматзначных лікаў. Гэтыя вылічальныя праблемы былі ў нейкай ступені вырашаны пасля адкрыцця лагарыфмаў і стварэння табліц лагарыфмаў.

?

1. Сфармулюйце тэарэму аб лагарыфме:
   а) здабытку; б) дзелі (дробу); в) ступені.
2. Дакажыце тэарэму аб лагарыфме:
   а) здабытку; б) дзелі (дробу); в) ступені.
3. Запішыце і абгрунтуйце формулу пераходу ад лагарыфма па адной аснове да лагарыфма па другой аснове.

4*. Дакажыце формулу:

   а) $\log_a b \cdot \log_b a = 1$; б) $\log_{a^q} b^p = \frac{p}{q}\log_a b$; в) $a^{\log_c b} = b^{\log_c a}$.

Практыкаванні

Вылічыце (**2.113—2.115**).

2.113°. 1) $\lg 5 + \lg 2$; 2) $\lg 8 + \lg 125$;
3) $\log_{12} 2 + \log_{12} 72$; 4) $\log_3 6 + \log_3 1{,}5$;
5) $\lg 25 + \lg 4$; 6) $\log_6 18 + \log_6 2$.

2.114°. 1) $\log_2 15 - \log_2 \frac{15}{16}$; 2) $\log_5 75 - \log_5 3$;
3) $\log_{\frac{1}{3}} 54 - \log_{\frac{1}{3}} 2$; 4) $\log_8 \frac{1}{16} - \log_8 32$;
5) $\log_{36} 84 - \log_{36} 14$; 6) $\log_{49} 84 - \log_{49} 12$.

2.115°. 1) $\log_8 12 - \log_8 15 + \log_8 20$;
2) $\log_9 15 + \log_9 18 - \log_9 10$;
3) $\log_2 39 - \log_2 13 - \log_2 24$;
4) $\log_6 34 - \log_6 17 + \log_6 18$;
5) $\log_4 91 - \log_4 13 - \log_4 3{,}5$;
6) $\log_5 \frac{1}{3} - \log_5 \frac{1}{150} + \log_5 2{,}5$.

2.116°. Спрасціце выраз:

1) $\log_{3^{15}} 7^5$; 2) $\log_{7^{20}} 4^{15}$;
3) $\log_{2^{18}} 5^{12}$; 4) $\log_{5^{16}} 11^{24}$.

Вылічыце (**2.117—2.119**).

2.117°. 1) $\log_{17} \sqrt[7]{289}$; 2) $\log_9 \sqrt[5]{6561}$;
3) $\log_{\frac{1}{5}} \sqrt[3]{625}$; 4) $\log_{\frac{1}{7}} \sqrt[5]{343}$;
5) $\log_6 \frac{1}{\sqrt[8]{216}}$; 6) $\log_4 \frac{1}{\sqrt[6]{1024}}$.

2.118°. 1) $\log_4 32$; 2) $\log_{32} 16$; 3) $\log_{\frac{1}{4}} 8$;
4) $\log_4 \frac{1}{128}$; 5) $\log_9 243$; 6) $\log_{2\sqrt{2}} 8$;
7) $\log_{2\sqrt{2}} \frac{1}{64}$; 8) $\log_{\frac{1}{8}} 2\sqrt{2}$; 9) $\log_{25} \frac{1}{5\sqrt{5}}$.

2.119°. 1) $\log_3 8 + 3\log_3 \frac{9}{2}$; 2) $\lg 5 + \frac{1}{2}\lg 40\,000$;
3) $\log_{0,3} 9 - 2\log_{0,3} 10$; 4) $\log_7 196 - 2\log_7 2$;
5) $\log_2 \sqrt{3} + \frac{1}{2}\log_2 \frac{4}{3}$; 6) $3\lg 5 + \frac{1}{2}\lg 64$;
7) $\log_{\sqrt{2}} 12 - \log_2 9$; 8) $\log_{\sqrt{3}} 12 - \log_{27} 16^3$;

9) $\frac{1}{2}\log_7 36 - \log_7 14 - 3\log_7 \sqrt[3]{21}$;

10) $2\log_{\frac{1}{3}} 6 - \frac{1}{2}\log_{\frac{1}{3}} 400 + 3\log_{\frac{1}{3}} \sqrt[3]{45}$.

Вылічыце (**2.120—2.122**).

2.120°. 1) $\frac{\log_3 8}{\log_3 16}$; 2) $\frac{\log_5 27}{\log_5 9}$; 3) $\frac{\lg 5}{\lg 25}$;

4) $\frac{\log_{0,2} 36}{\log_{0,2} \frac{1}{6}}$; 5) $\frac{\lg(3\sqrt{3})}{\lg \frac{1}{3}}$; 6) $\frac{\log_9 \frac{1}{6}}{\log_9 \sqrt{6}}$.

2.121. 1) $\frac{\log_5 36 - \log_5 12}{\log_5 9}$; 2) $\frac{\log_7 8}{\log_7 15 - \log_7 30}$;

3) $\frac{\lg 81 + \lg 64}{2\lg 3 + 3\lg 2}$; 4) $\frac{\lg 27 + \lg\sqrt{8}}{\lg 2 + 2\lg 3}$;

5) $\frac{\log_2 4 + \log_2 \sqrt{10}}{\log_2 20 + 3\log_2 2}$; 6) $\frac{\log_7 14 - \frac{1}{3}\log_7 56}{\log_6 30 - \frac{1}{2}\log_6 150}$;

7) $\frac{\log_2 24 - \frac{1}{2}\log_2 72}{\log_3 18 - \frac{1}{3}\log_3 72}$; 8) $\frac{3\log_7 2 - \frac{1}{2}\log_7 64}{4\log_5 2 + \frac{1}{3}\log_5 27}$.

2.122. 1) $\log_{\sqrt{3}}\left(2\operatorname{tg}\frac{9\pi}{8}\right) - \log_{\sqrt{3}}\left(1 - \operatorname{tg}^2\frac{9\pi}{8}\right)$;

2) $\log_9(2\operatorname{tg} 195°) - \log_9(1 - \operatorname{tg}^2 195°)$;

3) $\log_{\frac{1}{4}} \sin 375° + \log_{\frac{1}{4}} \cos 375°$;

4) $\log_8 \sin 795° + \log_8 \cos 795°$;

5) $\log_{\sqrt{3}}(2\cos 15° + 2\sin 15°) + \log_{\sqrt{3}}(\cos 15° - \sin 15°)$;

6) $\log_{\sqrt{2}}\left(2\cos\frac{\pi}{8} - 2\sin\frac{\pi}{8}\right) + \log_{\sqrt{2}}\left(\cos\frac{\pi}{8} + \sin\frac{\pi}{8}\right)$.

Знайдзіце значэнне выразу (**2.123—2.124**).

2.123*. 1) $\log_{\sqrt{2}-1}(\sqrt{2}+1)$; 2) $\log_{\sqrt{3}+2}(2-\sqrt{3})$;

3) $\log_{2\sqrt{2}+3}(3-2\sqrt{2})$; 4) $\log_{7-2\sqrt{12}}(7+2\sqrt{12})$;

5) $\log_{\sqrt{3}+1}(4+2\sqrt{3})$; 6) $\log_{5+2\sqrt{6}}(\sqrt{3}+\sqrt{2})$.

2.124*. 1) $\frac{\log_5 2}{\log_5 6} + \frac{\log_4 3}{\log_4 6}$; 2) $\frac{2\log_2 3}{\log_4 9} - \frac{\log_{27} 8}{\log_3 4}$;

3) $\left(\dfrac{\lg 125-2\lg 2}{\lg\sqrt[3]{4}+\lg 0{,}2}\right)^2$; 4) $\left(\dfrac{\log_6 25+2\log_6 2}{\log_6\sqrt[3]{0{,}000125}+\log_6\frac{1}{5}}\right)^3$;

5) $\left(\log_7 2+\dfrac{1}{\log_5 7}\right)\lg 7$; 6) $\left(\log_{13} 4+\dfrac{1}{\log_{25} 13}\right)\lg 13$.

2.125. Спрасціце выраз:

1) $\dfrac{1}{1+\log_2 3}$; 2) $\dfrac{1}{\log_4 5-1}$;

3) $\dfrac{2}{\log_3\frac{4}{5}-1}$; 4) $\dfrac{1-\log_2\frac{3}{7}}{2}$.

2.126. Ці правільная роўнасць:

1) $3^{\log_{11}5}=5^{\log_{11}3}$; 2) $7^{\log_\pi 4}=4^{\log_\pi 7}$;

3) $\log_9 7^4=2\log_3 7$; 4) $\log_{13^{15}} 2^{35}=\dfrac{7}{3}\log_{13} 2$;

